

...ІДУЦЬ ПРАЗ ТІКТОК У САЛДАТЫ

ЧЫРВОНКА

ПАТРЫЯТЫЗМ — АЛГАРЫТМ, ЯКІ НЕЛЬГА ПЕРАРЫВАЦЬ



ЧЫРВОНКА


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 МАЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 101 (29723)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Таццяна БРАНЦЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:**

*«Нягледзячы на санкцыйны ціск, працягвае выконвацца найважнейшая сацыяльная задача — заробкі ў рэальным выражэнні растуць. Па выніках чатырох месяцаў іх тэмп склаў 102 працэнты. Топ краінавых лідараў па намінальным узроўні заробкаў застаўся нязменным. Гэта IT, банкі і фінансы, навуковая дзейнасць, прамысловасць. Але для нас не менш важна, што высокія тэмпы рэальнага росту дэманстравалі даходы работнікаў тых галін, якія эфектыўна выраблялі і паспяхова рэалізоўвалі сваю прадукцыю на знешніх рынках. Гэта ў першую чаргу прадпрыемствы дрэваапрацоўкі (111,4 %), металургіі (105,1 %), вытворцы машын і абсталявання (104,9 %). Іншымі словамі, прыбаўка да зарплаты была сапраўды зароблена. Урад прымае шэраг мер па падтрыманні даходаў грамадзян, асабліва ў бюджэтнай сферы».*

# З ВЫШЫНІ ТЭХНАЛОГІЙ





Фота БелТА.

Аддзяленне функцыянальнай дыягностыкі і УГД Віцебскага абласнога дыягнастычнага цэнтра папоўнілася трыма новымі высокатэхналагічнымі апаратамі УГД. Два з іх установа аховы здароўя набыла за ўласныя сродкі, а адзін перадало Міністэрства аховы здароўя. Абсталяванне дазволіць пашырыць спектр УГД-даследаванняў і выяўляць анказахворванні на першай стадыі. Яшчэ адной навінкай для ВАДЦ стаў афтальмалагічны B-сканер. На ім можна выявіць адслаенне сятчаткі, разрывы, іншародныя целы, памутненне шклопадобнага цела, вызначыць кантузіі. Дакладнасць дыягностыкі дзякуючы гэтаму апарату павысілася ў дзясяткі разоў.

## КОРАТКА

• **Беларускія вучоныя распрацоўваюць імплантаты для паляпшэння зрошчвання касцявой тканкі.**

• МНС заклікае бацькоў нагадаць дзецям правілы бяспекі напярэдадні летніх канікулаў.

• **Клубу патрыётаў Падзвіння прысвояць імя генерал-лейтэнанта Івана Лісава.**

• Гала-канцэрт і піратэхнічнае шоу адкрыюць першы дзень фестывалю нацыянальных культур у Гродне.

Летнія перспектывы

# ЗЯЛЁНЫ ААЗІС СТАЛІЦЫ

### Прагуляцца па экасцежцы да стаянкі першабытнага чалавека можна ў батанічным садзе



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

Скульптура вучонага XVI стагоддзя на Алеі акадэмікаў. Гэта час, калі на тэрыторыі Беларусі пачалі развівацца садова-батанічнае мастацтва і ландшафтная архітэктура.

**Для большасці мінчан і гасцей сталіцы Цэнтральны батанічны сад — адно з любімых месцаў адпачынку, куток жывой прыроды ў самым цэнтры мегаполіса. Штогод яго наведваюць больш як 200 тысяч чалавек. Нават у зімовы час года гасцям тут прапануюць розныя актыўнасці: для іх ладзяць экскурсіі па аранжарэях трапічных раслін, арганізоўваюць фестываль-конкурс лядовых і снежных скульптур, ліхтароў, адзначаюць на яго тэрыторыі Каляды і Масленіцу... Але з 1 мая, калі ў садзе расцвітаюць сакура, магнолія, пладовыя дрэвы, рададэндраны і бэз, тут назіраецца сапраўдны аншлаг.**


СТАР. 4


Жыллё маё

# ЯК СЭКАНОМІЦЬ НА «КАМУНАЛЦЫ»

### Хто мае права на вяртанне грошай, а хто — заплаціць цалкам

**Атрымаць пераразлік за некаторыя камунальныя паслугі — вываз смецця, работу ліфта, газ і ваду (пры адсутнасці лічыльнікаў) — могуць жыхары, якія адсутнічалі па месцы пастаяннай рэгістрацыі больш як дзесяць дзён запар. Аднак такое правіла не распаўсюджваецца на катэгорыю так званых дармаедаў — беларусаў працаздольнага ўзросту, якія не працуюць і выехалі з краіны з 1 сакавіка гэтага года тэрмінам больш як на 30 дзён (выключэнне — выезд для лячэння ці аздараўлення). Яны будуць плаціць «камуналку» за жыллё, што знаходзіцца ў іх уласнасці, цалкам — па эканамічна абгрунтаваных тарыфах.**


СТАР. 3




Фота Ірыны СІДАРОК.


ISSN 1990 — 763X

Парламенцкі дзённік

# «СТРУКТУРУ ЭКАНОМІКІ ЎРАД БУДЗЕ ЗМЯНЯЦЬ»

**Работа ўрада сёння, па словах першага віцэ-прэм'ера Мікалая СНАПКОВА, будзе акцэнтавана на трох блоках: імпартазамяшчэнне, забеспячэнне стабільнага функцыянавання прадпрыемстваў, недапушчэнне пагаршэння жыцця людзей. З такой заявай ён выступіў на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. «Я ўпэўнены, што ў канчатковым выніку мы сфарміруем адаптыўную і ўстойлівую да новых рэалій эканоміку. Вельмі важная праграма імпартазамяшчэння не толькі з пункту гледжання замяшчэння тавараў, якія з тых ці іншых прычын не пастаўляюцца, але і з прычыны, што гэта дапаможа нам адаптаваць сваю эканоміку, замяніць яе структуру, зрабіць больш гібкай і менш залежнай ад энергетычных і прыродных тавараў, што займаюць вялікую ўдзельную вагу ў нашым экспартным парадку», — сказаў Мікалай Снапкоў.**



## Эканоміка ва ўмовах санкцый

«Асноўная задача ўрада — захаваць і забяспечыць усе сацыяльныя стандарты развіцця нашай дзяржавы і сацыяльныя праекты, якія вызначаюць узровень дабрабыту і камфортнасці жыцця насельніцтва, нягледзячы на санкцыі, што маюць беспрэцэдэнтны (а па вялікім рахунку ўдушлівы) характар. Канчатковая задума Захаду — нанесці ўдар па ўзроўню жыцця нашых людзей, выклікаць незадаволенасць, сацыяльнае напружанне», — сказаў першы намеснік прэм'ер-міністра.

Па яго словах, першай на сябе ўдар (яшчэ летась) прыняла авіяцыйная галіна. Далей былі забароны па калію, нафтаперапрацоўцы, абмежаванні ў дачыненні да пэўных прадпрыемстваў і фізічных асоб.

«У бягучым годзе мы атрымалі ўжо пяць пакетаў санкцый, у прапрацоўцы шосты», — заўважыў Мікалай Снапкоў.

Невыпадкова асноўны ўдар прыходзіцца на прамысловыя галіны і валютнаэкспартныя прадпрыемствы, дадаў віцэ-прэ'мер. Ускосна санкцыі ўздзейнічалі на будаўніцтва, сферу паслуг.

«Такім чынам, непасрэдны ўплыў санкцый закрануў 20 працэнтаў беларускай эканомікі, а ўскосна распаўсюдзіўся на ўсю астатнюю яе частку. З-за прамога санкцыйнага ўздзеяння за чатыры месяцы мы недаатрымалі 2,1 працэнта ВУП», — працягнуў першы намеснік прэм'ера.

Але тым не менш, па словах спікера, эканоміка Беларусі адаптуецца да такіх агрэсіўных дзеянняў: экспарт у першым квартале на 5 працэнтаў вышэйшы да ўзроўню мінулага года і дадатнае сальда рэкорднае, амаль у мільярд долараў ЗША.

Паводле Мікалая Снапкова, рэальныя даходы насельніцтва і заробкі захоўваюць дынаміку росту. За студзень-сакавік сёлета першыя выраслі на 0,2 працэнта, а другія — на 4,5 працэнта.

## Шляхі пераадолення негатыўнага ўплыву

Каб знізіць уплыў ціску, выбудавана трохузроўневая сістэма, паведаміў парламентарыям першы віцэ-прэм'ер. «Па-першае, у кожным ведамстве створаны штабы, якія аператыўна рэагуюць і вырашаюць галіновыя пытанні, а таксама пытанні канкрэтных прадпрыемстваў. Другі ўзровень — Рэспубліканскі аператыўна-сітуацыйны штаб, дзе на штодзённай аснове разглядаюцца праблемныя пытанні, што патрабуюць прыняцця рашэнняў на ўзроўні ўрада, — расказаў ён. — Трэці ўзровень — рабочая група па супрацьдзеянні санкцыям. Яна надзеленая кіраўніком краіны шырокімі паўнамоцтвамі і разглядае сістэмныя пытанні. Яны патрабуюць усебаковай ацэнкі наступстваў санкцыйных абмежаванняў і прыняцця кампенсацыйных рашэнняў, а таксама адказных мер на недружалюбныя дзеянні асобных дзяржаў».

Мікалай Снапкоў паведаміў, што ўрад мае чатыры прыярытэты, каб захаваць параметры работы эканомікі на леташнім узроўні. Гэта забеспячэнне бесперабойнай работы суб'ектаў гаспадарання, пераарыентацыя экспартных патокаў, імпартазамяшчэнне і падтрымка насельніцтва.

«Сілы і рэсурсы прадпрыемстваў, кампаній сёння павінны быць накіраваны толькі на выбудоўванне новых вытворчых ланцужкоў, пошукі магчымасцей для пашырэння бізнесу за кошт ніш, якія вызваляюцца пасля сыходу канкурэнтаў, у тым ліку на рынку Расійскай Федэрацыі. Гэта дапаможа вырашыць галоўную задачу — захаваць рабочыя месцы і даходы людзей», — мяркуе Мікалай Снапкоў.

Найбольш ёмістымі і перспектыўнымі рынкамі для пераарыентацыі экспарту, на яго погляд, з'яўляюцца Расія і Кітай. У сакавіку ў гэтыя краіны пастаўлена амаль 60 працэнтаў тавараў. У Расію экспарт можна нарасціць на 6,4 мільярда долараў ЗША (на 40 працэнтаў да леташняга ўзроўню). У КНР адпрацоўваюць экспартную заяўку на суму 2 мільярды долараў (палова сумы — пастаўкі харчавання). Тым не менш застаюцца тавары, па якіх хуткая пераарыентацыя немагчымая, — нафтапрадукты, нафта, калійныя, азотныя і змяшаныя ўгнаенні.

У кантэксце экспарту выключна важная задача — выбудоўванне новых транспартна-лагістычных ланцужкоў. Ціск узмоцнены на ўсе віды транспарту.

Поўнасцю спынены аўтаперавозкі ва ўкраінскім кірунку. З красавіка ЕС забараніў для беларускіх і расійскіх кампаній перавозкі грузаў у яго межах. «Прынята мера ў адказ — забаронены рух еўрапейскага аўтатранспарту на нашай тэрыторыі», — сказаў першы намеснік кіраўніка ўрада.

Для вырашэння праблем у доўгатэрміновай перспектыве прынята рашэнне аб будаўніцтве ўласнага порта ў Расіі.

«Закрыта таксама паветраная прастора Украіны. Большасць замежных авіяперавозчыкаў сышла з нашага рынку. З дзесяці перавозчыкаў, якія працавалі раней, засталося тры: «Белавія», «Узбекістан эарвэйс» і «Аэрафлот». Наша авіяцыя ў такіх умовах лётае па змененых маршрутах, што, на жаль, павялічвае час і адлегласць палётаў», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер.

Сёння ўвесь парк паветраных суднаў загружаны і забяспечвае лётную летнюю праграму «Белавія». Выконваюцца рэйсы ў восем дзяржаў.

Па словах Мікалая Снапкова, дзеянні недружалюбных краін паказалі важнасць пашырэння выпуску айчыннай прадукцыі. «Сёння для нашай краіны імпартазамяшчэнне — пытанне эканамічнага суверэнітэту. Работа вядзецца па двух асноўных кірунках. Першы — пошук альтэрнатыўных пастаўшчыкоў. Для гэтага сфарміраваны і накіраваны імпартныя заяўкі ў Кітай, працуем з Расіяй. За першы квартал аб'ём імпарту з названых краін па сыравіне, матэрыялах, камплектуючых



без энергарэсурсаў вырас на 473 мільёны долараў, — канстатаваў спікер. — Другі кірунак — вытворчасць айчынных аналагаў».

Над імпартазамяшчэннем працуюць галіновыя беларуска-расійскія рабочыя групы ў аўтамабілебудаванні, сельгасмашынабудаванні, станкабудаванні, электроніцы, лёгкай, хімічнай прамысловасці і фармацэўтыцы.

«Сёння стаіць задача максімальнага прыцягнення малога і сярэдняга бізнесу ў кааперацыйныя тэхналагічныя ланцужкі нашых флагманаў замест зніклых з рынку замежных пастаўшчыкоў», — дадаў першы намеснік старшыні Саўміна.

«Усяго за першы квартал малым і сярэднім бізнесам будзе створана імпартазамяшчальнай прадукцыі на суму 750 мільёнаў долараў», — падзяліўся інфармацыяй Мікалай Снапкоў.

## Падтрымка насельніцтва

«Урадам прыняты шэраг мер па падтрымцы росту даходаў. У рэальным сектары часова спынена рэгуляванне павышэння аплаты працы ў залежнасці ад росту вытворчасці. У бюджэтнай сферы першы этап павышэння базавай стаўкі на 4,5 працэнта адбыўся 1 студзеня, у другі этап плануецца павысіць на восем працэнтаў. Але для падтрымкі бюджэтнікаў урад прыняў рашэнне аб паэтапным павышэнні базавай стаўкі з апераджальным графікам», — растлумачыў выступоўца.

Ён заўважыў, што нягледзячы на санкцыі, сацыяльныя выплаты, пенсіі, заробкі выплачваюцца ў час і ў поўным памеры.

Пад кантролем рынак працы. Асобныя прадпрыемствы, заявіў Мікалай Снапкоў, аптымізуюцца, але масавага звальнення няма.

«Для вырашэння праблем на рынку працы мы стараемся працаваць на апярэджанне. Арганізаваны штотыднёвы маніторынг па выяўленні прадпрыемстваў, што прыпынілі дзейнасць, ці тых, што працуюць у рэжыме няпоўнай занятасці. На 18 мая такіх арганізацый 34», — сказаў першы віцэ-прэм'ер.

## Узровень цэн

Мікалай Снапкоў адзначыў павышаны запыт на прадукты харчавання, тэхніку, фармпрадукцыю ў сакавіку.

«Для стабілізацыі сітуацыі мы прынялі абмежаванні на вываз шэрагу тавараў і ўстаноўлены пералік пазіцый, забароненых да ўвозу з недружалюбных краін. Пры гэтым забароненыя тавары ўдалося замясціць альтэрнатыўнымі пастаўшчыкамі ўжо ў сакавіку. Мы прынялі ўсе магчымыя меры, каб нашы пакупнікі не адчулі адсутнасці асобных тавараў ці збояў у насычэнні ўнутранага рынку. У продажы быў і будзе прадстаўлены далей шырокі асартымент тавараў для пакупнікоў з розным узроўнем даходаў», — заявіў спікер.

Але ён не адмаўляе рост цэн на сыравінным і харчовым рынках. «Інфляцыя б'е рэкорды ва ўсіх краінах. Беларусь не стала выключэннем. У красавіку ў гадавым вылічэнні спажывецкія цэны выраслі на 16,8 працэнта. Асноўны ўнёсак у інфляцыю зрабілі мяса, мясапрадукты, агароднiна, садавіна, кандытарскія вырабы. Па нехарчовых таварах — легкавыя аўтамабілі, адзенне, электратавары і бензін. Па паслугах — жыллёва-камунальныя», — канстатаваў першы віцэ-прэм'ер.

Для рэгулявання цэн удакладнены пералік сацыяльна значных тавараў першай неабходнасці, уведзена дзяржаўнае рэгуляванне цэн на асобныя нехарчовыя тавары, якія карыстаюцца попытам, павялічана штомесячная мяжа змянення цэн для недапушчэння пагаршэння фінансавага стану прадпрыемстваў. Для вытворцаў, імпарцёраў канкрэтных груп тавараў і арганізацый гандлю ўстаноўлены гранічныя максімальныя нарматывы рэнтабельнасці і гандлёвай надбаўкі.

«Сёння сітуацыя па цэнах стабілізуецца. У маі месячны прырост цэн значна запаволіўся. Па многіх пазіцыях так званага баршчовага набору — увайшоў у адмоўную зону», — заявіў Мікалай Снапкоў.

Фота БелТА.

# ДЭПУТАТЫ ПРЫНЯЛІ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ АДНАЎЛЯЛЬНЫХ КРЫНІЦАХ ЭНЕРГІІ

**Законапраект «Аб рэгуляванні адносін у сферы выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі» разгледжаны і прыняты ў двух чытаннях на пасяджэнні восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў.**

Законапраект быў унесены Саветам Міністраў у мэтах выканання даручэння Прэзідэнта. Ён накіраваны на падтрымку рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва шляхам стрымлівання росту тарыфаў на электрычную энергію за кошт зніжэння затрат энергазабеспечвальных арганізацый «Белэнерга», пры набыцці электраэнергіі ад установак, якія працуюць з выкарыстаннем аднаўляльных крыніц энергіі.

Па словах члена Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Дзяніса Карася, тэматыка законапраекта абмяркоўваецца даўно, у дыскусію ўцягнуты прадстаўнікі розных ведамстваў, бізнесу і дэпутацкага корпуса.

«Шэраг назапашаных праблемных, складаных пытанняў прывёў да неабходнасці чарговай карэкціроўкі рэгулятарных падыходаў. У выніку іх прапрацоўкі ўрадам, абмеркавання ў кіраўніка краіны былі сфармуляваны дакладныя падыходы, якія дазваляюць вызначыць кірункі развіцця аднаўляльнай энергетыкі на найбліжэйшую перспектыву», — сказаў парламентарый.

У другой палове дня закон аб аднаўляльных крыніцах энергіі быў адобраны і Саветам Рэспублікі.

**Матэрыялы падрыхтавала Марыя ДАДАЛКА.**

# ЯК СЭКАНОМІЦЬ НА «КАМУНАЛЦЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хто мае права на пераразлік і як сэканоміць грошы за «камуналку», калі вы доўгі час не жывяце па месцы пастаяннай рэгістрацыі, расказала спецыяліст.



Форма

СПРАВКА
для перерасчета платы за некоторые виды коммунальных услуг

Выдана гражданину(ке) ____
проживающему(ей) по адресу ____
в том, что в период с ____ по ____
находился(ась) ____

Настоящая справка действительна в течение одного месяца с даты ее выдачи.

М.П.

## Падзеленыя гігакалорыі

Штогод па завяршэнні ацяпляльнага сезона многім жыхарам шматкватэрных дамоў робяць пераразлік аплаты за цеплаэнергію, выдаткаваную на ацяпленне і падагрэў вады. Адбываецца тое аўтаматычна — ніякіх заяў пісаць не трэба, тлумачаць камунальнікі.

Разлік за спажыванне цяпла кожнага жылога дома робіцца зыходзячы з паказчыкаў групавых лічыльнікаў (большасць «шматкватэрнікаў» у сталіцы аснашчана менавіта імі), якія фіксуюць колькасць патрачанага цяпла на абаграванне кватэр, пад'ездаў і іншых месцаў агульнага карыстання. Агульная колькасць гігакалорый дзеліцца паміж уласнікамі прапарцыянальна плошчы займанага імі памяшкання. Пры гэтым аб'ём энергіі, якая пайшла на падаграванне вады, налічваецца згодна з паказчыкамі пакватэрных індывідуальных лічыльнікаў гарачага водазабеспячэння. Калі іх няма — разлік робяць згодна з нарматывамі: 130 літраў вады ў суткі на чалавека.

Асаблівая катэгорыя — грамадзяне, якія маюць у кватэрах лічыльнікі цяпла і знаходзяцца на тэхабслугоўванні разлікова-сэрвісных арганізацый. Падчас ацяпляльнага перыяду такія жыхары плацяць згодна з паказчыкамі групавой прылады ўліку, а калі ацяпленне адключаюць — індывідуальны аб'ём цеплаэнергіі для кожнай кватэры будзе пералічаны згодна з паказчыкамі індывідуальных лічыльнікаў цяпла.

Жыхары дамоў, дзе ў кватэрах на батарэях установлены рэгулятары цяпла, таксама могуць змяншыць свае сумы «камуналкі» пасля ацяпляльнага сезона, асабліва калі ім не падабаецца гарачыня. А аматары зімняга адпачынку, што едуць у водпуск, могуць увогуле на час сваёй адсутнасці выставіць на прыладзе ўліку цяпла тэмпературны мінімум, заўважыла **Таццяна МАЗОЎКА, намеснік начальніка разлікова-даведачнага цэнтра № 2 Заводскага раёна Мінска:**

— Увесь ацяпляльны перыяд такія жыхары аплачваюць ацяпленне па пэўных нарматывах, а калі ён заканчваецца, здымаюцца паказчыкі лічыльнікаў на ацяпленне і ўдакладняюцца лічбы зрасходаваных гігакалорый. У выніку ў маі многім уласнікам памяншаюць лічбы ў жыроўцы за ацяпленне. А некаторым, хто не звяртае ўвагі, што батарэя «смаліць», і не рэгулюе цяпло, наадварот — могуць у выніку і дадаць, бо падчас ацяплення сумы ім налічваліся, як і тым, хто эканоміў на цяпле.

Калі ўласнік ці наймальнік жылля бачыць, што лічбы ў жыроўцы раптоўна павялічыліся, трэба неадкладна высвятляць прычыну змянення тарыфаў, раіць спецыяліст:

— Вядома, калі чалавек зняўся з рэгістрацыі і кватэра засталася пустой (у ёй ніхто не зарэгістраваны), то налічэнні будуць рабіць па эканамічна абгрунтаваных тарыфах. Аднак калі нічога не мянялася, то, магчыма, ён трапіў у базу дармаедаў, і трэба высвятляць на сайце адміністрацыі па месцы пастаяннай рэгістрацыі, што здарылася. На сайце ёсць магчымасць прымацаваць дакумент, якім чалавек растлумачыць, што ён, напрыклад, працуе за мяжой, таму не можа лічыцца дармаедам. У такім выпадку жыхару ў наступным квартале будзе зроблены пераразлік за камунальныя паслугі.

## Пераразлік за вываз смецця і работу ліфта

Калі чалавек, зарэгістраваны па месцы пастаяннага жыхарства ў Мінску, з'язджае з яго больш як на дзесяць сутак запар, ён можа па заяўным прынцыпе звярнуцца ў разлікова-даведачны цэнтр (РДЦ), да якога адносіцца, і напісаць заяву на часовую адсутнасць з указаннем яе тэрміну. Вярнуўшыся назад, ён мусіць на працягу сямі дзён прынесці даведку, якая пацвердзіць яго адсутнасць, расказала Таццяна Мазоўка:

— Такім чынам жыхар атрымае льготу на аплату паслугі па вывазе і абясшкоджванні цвёрдых бытавых адходаў (цяпер гэта 2,2 рубля штомесяц з чалавека). А таксама на аплату электраэнергіі, якая ўжываецца для работы ліфта, — гэтая сума залежыць ад колькасці жыхароў кватэры (за выключэннем дзяцей да сямі гадоў). Пры гэтым варта памятаць, што грошы за дадзеную паслугу налічваюцца з другой прыпыначнай пляцоўкі. То-бок калі ліфт ходзіць з першага паверха, то жыхары другога — ужо плацяць за яго работу, а калі да ліфта трэба падымацца на другі паверх, то плата за яго налічваецца ўжо для жыхароў пачынаючы з трэцяга паверха. Калі ў жыхара не ўстаноўлены лічыльнікі на газ і ваду, то ён атрымае пераразлік яшчэ і за іх. Калі лічыльнікі ёсць — аплата адбудзецца па факце выкарыстанага рэсурсу. Расходу падчас адсутнасці жыхара не было, значыць, і колькасць ужытых вады і газу нулявая.

Хоць пастановай прадугледжаны заяўны прынцып атрымання пераразліку, здараецца, што чалавек не можа загадзя паведаміць пра сваю часовую адсутнасць па месцы пастаяннай рэгістрацыі. Магчыма, ён трапіў у бальніцу або тэрмінова з'ехаў, а можа, проста не ведаў, што трэба напісаць заяву. Вярнуўшыся дадому, ён на працягу сямі дзён таксама можа прыйсці ў РДЦ, прынесці даведку аб прычыне адсутнасці і напісаць заяву на такі перыяд — пераразлік за камунальныя паслугі на гэты час таксама зробяць. Існуе нават даведка ўстаноўленай формы, якую могуць запоўніць афіцыйныя органы таго месца, дзе знаходзіўся чалавек (сельсавет, бальніца, санаторый, турма, вайсковая часць і іншыя), указаўшы пэўны перыяд яго прысутнасці там.

— Абавязковая ўмова пры часовай адсутнасці: чалавек у гэты тэрмін не павінен з'яўляцца па месцы пастаяннай рэгістрацыі. Інакш, калі пра тое даведаецца ЖЭС, жыхара пазбавяць ільготы за час, што ён правёў дома. Вядома, лепш папярэджваць сваю адсутнасць штогод, аднак калі вы з'ехалі на вельмі працяглы тэрмін, то пераразлік можна атрымаць за тры гады, а даведку аб часовай рэгістрацыі — дасылаць па пошце (напрыклад, калі чалавек з'ехаў на вёску або за мяжу). Заяву, якую павінен скласці сам адсутны, можа напісаць за яго па даверанасці і іншы, — акцэнтавала ўвагу спецыяліст.

Карыстацца такім пераразлікам могуць дачнікі, студэнты, асобы, што выехалі ў водпуск, на лячэнне, трапілі ў бальніцу ці турму і іншыя.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

### Няякасна ці няпоўнасцю

Выпадкі, калі жыхарам належыць пераразлік за няякасныя або не ў поўнай меры аказаныя жыллёва-камунальныя паслугі, акрэслены ў пастанове Саўміна № 99 «Аб мерах па рэалізацыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг».

Прэтэндаваць на пераразлік можна, калі ў ацяпляльны перыяд у кватэры суткі ці больш трымаецца тэмпература менш за +18 °С або вышэй за +24 °С. Перагледзяць сумы плацяжоў, і калі гарачая вада ў кране суткі і больш халаднейшая за +50 °С.

Калі з дома своечасова не вывозяць смецце, не робяць тэхабслугоўванне, прыбіраюць у пад'ездзе не па графіку, жыхары таксама могуць разлічваць на пераразлік сум за гэтыя паслугі. А яшчэ — калі пітная вада не адпавядае вызначаным санітарна-эпідэміялагічным патрабаванням.

У дакуменце таксама ўдакладняецца, што «камуналка» можа быць паменшана на 10 % за месяц, калі перавышана дапушчальная працягласць перапынкаў у халодным водазабеспячэнні ці водаадвядзенні (каналізацыі) больш за два разы на месяц і пры ўзнікненні перапынкаў у электра- і газазабеспячэнні на суткі больш як два разы на месяц.

Па сутнасці

# НА АРЭЛЯХ ЮНАЦТВА



**Даруйце. Трохі аб асабістым. Перад Радаўніцай пашчасціла з выхаднымі. Змог дапамагчы маці прыбіраць магілкі. Гэта святое. Адчуваеш раскідзістыя шаты свайго радаслоўнага дрэва. Прыемныя ўспаміны пра тых, каго няма, але засталіся ў душы і сэрцы — жывой памяці. А яшчэ менавіта перад Радаўніцай можна сустрэцца з землякамі. Тымі, каго даўно не бачыў і не ведаеш, калі яшчэ ўбачыш.**

Каля сцежкі пад грузам смецця, галля і спудам забыцця стаяў крыж. Гэта магіла бабулі, у якой вайна адняла сына. Пакуль мы наводзілі парадак, маці распавяла і пра жыццё гэтай бабулі, і пра тое, як яны, піянеры, прыходзілі і дапамагалі ёй па гаспадарцы. Чырвоныя гальштукі і марш на словы Жарава ды музыку Дзёшкіна — былі толькі атрыбуты. Галоўнае — гэта работа на карысць школы, грамадства, дзяржавы, работа над сабой. Менавіта «дзеці рабочых» сталі дзецьмі эпохі. На «чэсным піянерскім» трымаліся любоў да Радзімы, павага да старэйшых, сапраўднае сяброўства. Як бы там хто пагардліва ні ўхмыляўся, але пад словы: «Взвейтесь кострами, синие ночи! Мы пионеры — дети рабочих» пад гукі барабана і горна ў дарослае жыццё, у вялікі свет маршыравалі будучыя Мараты Казеі, маладагвардзейцы, Гагарыны, будаўнікі БАМа, геолагі Сібіры, даследчыкі Арктыкі, альпіністы Казбека, навукоўцы фізікі лазераў, выканаўцы «Спадчыны» і волі народа. Усе яны ў свой час былі піянерамі.

Цяпер паўсюль — валанцёры. Нават модна быць валанцёрам. Добра. Моладзь прывучаецца дапамагаць. Не быць эгаістамі. Бо як кажуць нават самі настаўнікі, эгаізм прапісаны ў адукацыйных праграмах. Дзяцей узнялі на пастамент асабліваслі. Паставіць — паставілі. А зняць забылі....

Ну добра, хоць бы валанцёры. Але чаму не піянеры? Я зразумеў. Валанцёр — гэта часовае становішча. Сёння — валанцёр, пакуль не надакучыла, заўтра — фрык. А вось піянер — гэта ўжо сур'ёзна. Нават «чыліцца» (па-маладзёжнаму — адпачываць) няма калі. Ды і з гальштукам тату не пасуе. Піянер — гэта ўжо сталы выбар. Шкаляры звычайна мараць аб дарослаці. А тут насамрэч хапае адказнасці.

Сёння быць піянерам — не тое, што раней. Раней гэта была звычайная справа. Дзеці з чырвонымі гальштукамі — мэйнстрым савецкай рэчаіснасці. Цяпер на дзяцей з чырвона-зялёнымі гальштукамі аглядаюцца. Маўляў, ледзьве не рудымент. А быў час — нават кпілі, адварочваліся. На звалку гісторыі. Савецкае — значыць дрэннае. Таму, маўляў, пад корань гэтае дрэва пераемнасці пакаленняў. Піянеры — дрэнна, а пахабныя фільмы не першага сорту ў вячэрнім прайм-тайме альбо ў нядзелю днём — добра? Замест піянерскай прынцыповасці — «блакітны экран». Экраны ў гаджэтаў — нібы вясёлкавая палітра. У гэтых экранах нават бацькі. А дзеці дзе? Зноў страчанае пакаленне?

Таму і ў свой стагадовы юбілей піянерскае вогнішча не згасла. Адчуваю, вось пачнуцца абвінавачанні: ідэалогія, прапаганда — навошта залішняя занятасць моладзі? Вядома, хай моладзь у айфонах паглынае чужаземную ідэалогію і заморскую прапаганду. Хай тая заходзіць, як кажуць зумеры, «на ізі». А чаму ж нам так не паспрабаваць?

Зразумела, прывіць прымітыўныя, сцёбныя паводзіны лягчэй, чым закласці ў падлетка штосьці святое і светлае. А гады юнацтва — гады выпрабавання. Нібыта тое дрэўца цягнецца ў вышыню, прагнаназапашвае сацыяльны вопыт. А ён можа быць які заўгодна, гэты вопыт. І, на жаль, без падтрымкі бацькоў, школы ды грамадскага згуртавання — адмоўным. Некалі думалі, што зямля трымаецца на трох кітах. Дык вось, тры кіты выхавання падлеткаў (здаровага чалавека) — гэта бацькі, школа і пазітыўная суполка. І тады ніякі «сіні кіт» ужо не праглыне ў сваю бязлітасную прорву нашу моладзь.

Чаму піянерская арганізацыя? А чаму не? Няўжо такія модныя скаўты лепш? Пачакайце абурацца. Маўляў, тое ж не палітычны саюз, а наднацыянальны. Давайце прыгадаем, чаму скаўтаў навучалі польскія дыпламаты ў Брэсце. І што сёння азначае наднацыянальны саюз. Той, які адпавядае мэтам сучаснай глабалізацыі. А пра тое, што такое сучасная глабалізацыя, кіраўнік дзяржавы яскрава распавёў падчас выступлення ў месцы нашай сілы — на плошчы Перамогі. Там, дарэчы, прысутнічалі і піянеры Беларусі.

Першапачатковы сэнс слова «піянер» — гэта першапраходзец. А яны — маладыя — і насамрэч на скрыжаванні. Памятаеце, як у Коласа — стаяць на ростанях. У час, калі штодня праз чалавека праходзяць больш інфармацыі, чым некалі за год, вельмі цяжка не збочыць у дрыгву постгуманізму. Дзе замест бацькоў і Радзімы на першым плане — ідэалогія лічбы. І ў літаральным сэнсе — а колькі гэта каштуе і колькі мне прынясе? І ў сацыяльным плане — лічбавы светапогляд. Прыгадаем песню няўкрадзенага тэхналогіямі дзяцінства — «Крылатые качели». Дайсці ж да «цудоўнага далёка» разам — піянерскім маршам — значна лягчэй.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ЗЯЛЁНЫ ААЗІС СТАЛІЦЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, калекцыя бэзу Цэнтральнага батанічнага сада атрымала міжнароднае прызнанне, цяпер яна налічвае больш за 200 сартоў. Асаблівую каштоўнасць складаюць сарты ўласнай селекцыі. Рададэндранаў у садзе — каля 80 відаў і больш як 140 сартоў. Ёсць сарты, якія расцвітаюць яшчэ ў красавіку, а апошнія завяршаюць сваё цвіценне ў пачатку жніўня. У апошнія гады калекцыя актыўна папаўняецца.



Стаянка старажытнага чалавека налічвае тры аб'екты, якія адпавядаюць бронзаваму веку. Яны выраблены з падручнага прыроднага матэрыялу.

## Размнажэнне ў прабірцы

— Хачу заўважыць, што Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук — гэта комплекснае навуковая і культурна-асветніцкая ўстанова, — расказвае яго **дырэктар, кандыдат сельскагаспадарчых навук Валянцін ШАТРАЎКА.** — Першы наш напрамак — навука: цяпер мы распрацоўваем і суправаджаем 47 навуковых тэм. Другі — захаванне калекцый. Большая частка раслін на тэрыторыі сада абвешчана нацыянальным здабыткам, і мы займаемся тым, што захоўваем іх для будучых пакаленняў. Гэта самы вялікі ў краіне цэнтр па захаванні біяразнастайнасці жывых раслін. На плошчы 93 гектары ў нас прадстаўлена 45 калекцый, якія налічваюць каля 15 тысяч розных відаў раслін.

Трэці напрамак — прамысловы: мы займаемся вырошчваннем раслін на продаж. Шмат намаганняў навукоўцаў скіравана на развіццё ягадаводства — новай для Беларусі экспартна арыентаванай і імпартазамяшчальнай галіны. Стаўка зроблена на вырошчванне высакарослых буякоў, брусніц, буйнаплодных журавін, бружмелю. Гэтая прадукцыя экспартуецца ў Расію, Казахстан, іншыя краіны СНД. За 2021 год было рэалізавана імпартазамяшчальнай прадукцыі на 300 тысяч долараў.

У 2018 годзе быў цалкам уведзены ў эксплуатацыю біятэхналагічны комплекс Цэнтральнага батанічнага сада, які сумяшчае вытворчы і навуковы напрамкі дзейнасці. Сёння гэта адзін з найбольш перадавых комплексаў у краіне.

Па словах **загадчыцы навукова-вытворчага аддзела комплексу Веранікі ФІЛІПЕНІ,** да 2024 года тут плануецца вырошчваць паўмільёна саджанцаў у год:

— Па магчымасці будзем вырошчваць і больш прадукцыі, таму што яна запатрабаваная. Сёлета будзе выраблена не менш як 200 тысяч саджанцаў, летась было 100 тысяч. Мы развіваем тэхналогію кланіравання in vitro — гэта размнажэнне саджанцаў любых раслінных культур мікрачаранкамі ў прабірцы. Для гэтага бяром стэрыльны раслінны матэрыял. Шляхам тэхнічных маніпуляцый дзелім і высаджваем яго на спецыяльнае пажыўнае асяроддзе ў адмысловых стэрыльных боксах. Перавагі такой тэхналогіі ў тым, што саджанцы можна вырабляць круглы год. Для гэтага не трэба трымаць вялікія матачнікі кустоў, як пры звычайным чаранкаванні. У маленькім 200-грамовым слоічку на пажыўным асяроддзі вырошчваем ад 30 да 50 мікрасаджанцаў. Гэта дазваляе хутка і масава размножыць запатрабаваныя культуры. Адзін аператар можа пасадзіць за дзень да двух тысяч мікрачаранкоў.

Увогуле метад мікракланальнага размнажэння мае шэраг пераваг перад традыцыйнымі яго спосабамі. Гэта атрыманне генетычна аднароднага пасадачнага матэрыялу, захаванне чысціні сартоў, абароненасць ад вірусаў і паразітаў, скарачэнне працягласці селекцыйнага працэсу.

Праводзяць аналіз на наяўнасць вірусаў і сортаадпаведнасць у малекулярнай лабараторыі, якая дзейнічае ў складзе біятэхналагічнага комплексу. Дырэктар Батанічнага сада Валянцін Шатраўка заўважыў: у хуткім часе лабараторыя павінна прайсці акрэдытацыю, што дасць магчымасць рэалізоўваць сертыфікаваныя расліны.

У планах на будучыню — максімальна скараціць на біятэхналагічным комплексе ручную працу і там, дзе магчыма, перайсці на поўную аўтаматызацыю. Толькі ўявіце сабе, што 500 тысяч саджанцаў трэба будзе тройчы перасаджваць — атрымліваецца 1,5 мільёна такіх маніпуляцый, а ў цяпліцы працуюць толькі тры чалавекі...

## Свая спецыфіка

У 2017 годзе ў гонар Года навукі ў Цэнтральным батанічным садзе была закладзена Алея акадэмікаў. Колькасць пасаджаных таполяў адпавядала колькасці акадэмікаў у Нацыянальнай акадэміі навук на той час. Тады ж быў устаноўлены і памятны камень. А зусім нядаўна тут з'явілася скульптура вучонага XVI стагоддзя. Як вынікае з гістарычных звестак, менавіта ў гэтым стагоддзі на тэрыторыі Беларусі пачалі развівацца садова-батанічнае мастацтва і ландшафтная архітэктура. Прыкладна ў тыя ж часы быў закладзены і Нясвіжскі парк. Дарэчы, у розных беларускіх гарадах у парках захаваліся дрэвы з трохсотгадовай гісторыяй. Іх генафонд адбіраецца і вывучаецца спецыялістамі.

У адрозненне ад іншых навуковых устаноў, у Батанічнага сада ёсць свая спецыфіка: гэта і пастаянныя метэаралагічныя пагрозы, і ўзрост некаторых раслін. Самым старым дрэвам на тэрыторыі сада ўжо больш як 100 гадоў. Алеі, якія з'яўляюцца візітоўкамі Батанічнага, вельмі складана захоўваць, бо калі загінула нават адно дрэва, то алея ўжо страчвае свой ранейшы выгляд. Між іншым, з-за моцнага ветру ў студзені гэтага года на тэрыторыі сада было пашкоджана каля 250 кубаметраў драўніны.

Даводзіцца змагацца і з такой навалай, як кляшчы. Усе насаджэнні ўздоўж алей апрыскваюцца, каб засцерагчы наведвальнікаў ад непажаданай сустрэчы.

## Дарога ў... бронзавы век

Адзін з апошніх рэалізаваных праектаў Цэнтральнага батанічнага сада — экалагічна-міфалагічная сцежка «Легенды беларускай флоры» агульнай працягласцю каля 400 метраў, якая пралягае ў лесапаркавай зоне паўднёвай часткі сада. Абраўшы гэты маршрут, можна далучыцца да гісторыі роднай зямлі — пазнаёміцца з абрадавымі і рытуальнымі традыцыямі, звязанымі з пэўнымі раслінамі, з легендамі і міфамі пра іх. На ўстаноўленых каля раслін этыкетках ёсць QR-коды. Ініцыяваўшы код з дапамогай мабільнай праграмы на смартфоне, атрымліваеш доступ да звестак аб расліне. У шэрагу выпадкаў маюцца актыўныя спасылкі на шэсць тэматычных рубрык: «Гэта цікава», «Народныя легенды і міфы», «Гаспадарчае выкарыстанне» і іншыя.

Некаторыя з раслін нам добра знаёмыя. Асобныя мы ведаем «у твар», але не ведаем, як яны правільна называюцца. Некаторыя заўсёды побач з намі, але мы іх проста не заўважаем. А нейкія настолькі рэдкія, што нават не ўсе спецыялісты бачылі іх у месцах натуральнага асяроддзя.

У адрозненне ад нас нашы продкі больш цесна кантактавалі з навакольным раслінным светам, ведалі пра карысныя ўласцівасці шматлікіх раслін, і гэтыя веды перадаваліся з пакалення ў пакаленне. У вуснай народнай творчасці рацыянальныя звесткі абрасталі легендамі і міфамі. У асобныя расліны продкі «ўдыхнулі» душу і звязалі іх з язычніцкімі багамі. Расліны прыйшлі ў магічныя рытуалы і святочныя абрады. Усім добра вядомая легенда аб папараці, у якой чароўная кветка распускаецца раз на год у ноч на Івана Купалу. У старажытных славян папараць лічылася магічнай раслінай.

Прыкладна месяц таму побач з міфалагічнай сцежкай на паляне збудавалі стаянку старажытнага чалавека. Як расказаў Валянцін Шатраўка, ідэя яе стварэння з'явілася яшчэ ў 2016 годзе, аднак толькі ў лютым бягучага года быў заключаны дагавор з арганізацыяй, распрацаваны макет стаянкі, чарцяжы, якія ўзгадняліся з Інстытутам гісторыі Акадэміі навук. Трэба было, каб усё адпавядала гістарычнай рэчаіснасці. Экспазіцыя пад адкрытым небам налічвае тры аб'екты, якія адпавядаюць бронзаваму веку. Гэта не пастаяннае паселішча старажытнага чалавека, а яго часовае жыллё і дапаможныя памяшканні, выраблены з падручнага прыроднага матэрыялу, у дадзеным выпадку чароту. У далейшым плануецца ўстанавіць крыты трысняговым пчаліны вулей. Таксама будзе выканана агароджа стаянкі з выкарыстаннем драўляных калоў. Размесцяць і новыя элементы малой архітэктурнай формы. Таксама плануецца інтэрактыўнае выкарыстанне аб'екта ў экскурсійных маршрутах. Гасцей збіраюцца частаваць тут гарбатай з траў, якія расці здаўна на тэрыторыі нашай краіны. Ёсць і іншыя ідэі, якія супрацоўнікі навуковай установы пакуль не спяшаюцца раскрываць.

## Бясконцы працэс

А яшчэ ў Цэнтральным батанічным садзе павінен з'явіцца Музей пчалярства. «Мы ўваходзім у кластар па пчалярстве, створаны ў Акадэміі навук. На пчальніку Батанічнага сада ўтрымліваюцца 20 пчоласем'яў, кожная з якіх за мінулы год прынесла па 15 кілаграмаў мёду. У планах — далейшае развіццё пчальніка да 30 пчоласем'яў, — расказвае Валянцін Шатраўка. — Праводзяцца ў нас і навуковыя даследаванні. Цяпер працуем над стварэннем музея, які стане яшчэ адным экскурсійным аб'ектам. Пакуль зрабілі першыя крокі, адрамантавалі знадворную частку будынка. Далей будзем напаўняць яго прыстасаваннямі і прадметамі, якія выкарыстоўваюцца менавіта для пчалярства, рознымі цікавінкамі. Спадзяюся, што да наступнага сезона асноўная экспазіцыя ўжо адкрыецца».

Таксама сёлета ў батанічным садзе плануюць добраўпарадкаваць азёрны комплекс. Асноўныя работы па рэканструкцыі закрануць набярэжную і масток. «Там рамонт праходзіў даўнавата, таму некаторыя драўляныя элементы падгнілі, — растлумачыў дырэктар. — Акрамя таго, на тэрыторыі батанічнага сада працягнуць устанаўліваць новыя архітэктурныя формы і альтанкі. Увогуле, развіццё сада — працэс бясконцы. Навукова-даследчая, адукацыйная і асветніцкая работа ідуць паралельна з павышэннем прывабнасці сада для наведвальнікаў. Хутка ў нас з'явіцца таджыкскі кут. Цяпер вядзём будаўніцтва пляцоўкі, дзе будуць высаджаны расліны, характэрныя для флоры Таджыкістана. Гэты куток дапоўніць адзін з сектараў, прысвечаных Сярэдняй Азіі. На гэтай тэрыторыі ўжо растуць некаторыя драўніна-хмызняковыя расліны, кампазіцыю дапоўняць культуры, прывезеныя непасрэдна з Таджыкістана. Адкрыццё плануецца да сярэдзіны лета».

**Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара.**

**А з 26 да 29 мая Цэнтральны батанічны сад запрашае ўсіх на экскурсіі па калекцыях бэзу і рададэндранаў, якія праводзяць навуковыя супрацоўнікі.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Стральба ў пачатковай школе Тэхаса: загінулі 19 дзяцей і двое дарослых



**У амерыканскім штаце Тэхас адбылася стральба ў будынку пачатковай школы, у выніку якой, паводле апошніх даных, загінулі 19 дзяцей і двое дарослых, піша ТАСС.**

Мясцовая прэса паведамляе, што трагедыя адбылася ў Ювалдзе каля 12.00 па мясцовым часе. Праз гадзіну пасля здарэння паліцыя расказала аб затрыманні 18-гадовага Сальвадора Рамаса. Пазней стала вядома, што злачынец ліквідаваны. Губернатар штата Тэхас Грэг Эбат адзначыў, што апошні быў узброены пісталетам.

У бальніцу шпіталізаваны 13 школьнікаў. Кулявое раненне таксама атрымаў 45-гадовы мужчына. На гэты момант нічога не вядома аб іх стане здароўя.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне народу Злучаных Штатаў Амерыкі ў сувязі з трагедыяй у горадзе Ювалд штата Тэхас, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«У Беларусі з вялікім болем успрынялі вестку аб шматлікіх ахвярах, абсалютную большасць з якіх складаюць дзеці, у выніку бязлітаснай расправы ў пачатковай школе горада Ювалд у штаце Тэхас. Незаменная страта для бацькоў, блізкіх і сяброў. Такія жудасныя трагедыі здараюцца ў тым ліку з-за адсутнасці належнага кантролю за абаротам зброі ў сукупнасці з бяздумным распаўсюджваннем, асабліва ў сацыяльных сетках, прапагандысцкіх матэрыялаў аб экстрэмізме, тэрарызме, а таксама іншага дэструктыўнага кантэнту, які стварае эмацыянальны прэсінг для неакрэплай псіхікі падрастаючага пакалення.

Сёння ўсёй сусветнай грамадскасці неабходна аб'яднаць намаганні для барацьбы з гэтымі выклікамі, паколькі яны не маюць дзяржаўных граніц.

Ад усіх беларусаў і ад сябе асабіста накіроўваю шчырыя спачуванні і словы падтрымкі родным загінулых і ўсяму народу Злучаных Штатаў Амерыкі, а таксама пажаданні хутчэйшага выздараўлення параненым», — гаворыцца ў спачуванні.

### «Балонская сістэма — пражыты этап». Расія перастане рыхтаваць бакалаўраў і магістраў

**Кіраўнік Міністэрства адукацыі і навукі РФ Валерый Фалькоў заявіў, што Расіі час адмовіцца ад еўрапейскай Балонскай сістэмы і распрацаваць свой унікальны падыход да вышэйшай адукацыі.**

Мінадукацыі заявіла, што ўжо падрыхтавала неабходную пераходную праграму. Раней супраць Балонскай сістэмы выступіў сакратар Савета бяспекі Мікалай Патрушаў. Ён заявіў, што расійскіх студэнтаў і выкладчыкаў «выцskaюць з заходняй навукова-адукацыйнай сферы».

Расія павінна стварыць уласную ўнікальную сістэму адукацыі, а не карыстацца заходняй, заявіў «Коммерсанту» Фалькоў.

«Да Балонскай сістэмы трэба ставіцца як да пражытага этапу. Будучыня за нашай уласнай унікальнай сістэмай адукацыі, у аснове якой павінны ляжаць інтарэсы нацыянальнай эканомікі і максімальная прастора магчымасцяў для кожнага студэнта», — сказаў міністр.

# Урад не для народа

## Чаму польскія ўлады ашукваюць людзей?

Інфляцыя ў Польшчы ў красавіку дасягнула новага максімуму — 12,4 працэнта. У параўнанні з папярэднім месяцам цэны на тавары і паслугі ўзраслі на два працэнты, паведаміў польскі інфармацыйны партал радыё RMF24 са спасылкай на Цэнтральнае статыстычнае ўпраўленне Польшчы. У параўнанні з красавіком мінулага года цэны на прадукты харчавання і безалкагольныя напіткі павялічыліся на 12,7 працэнта, а цэны на алкаголь і цыгарэты — на 5,9. Транспартныя паслугі падаражэлі на 21,1 працэнта. Наведванне рэстаранаў і гасцініц за год стала даражэйшае на 14,1 працэнта, забаўляльных і культурных мерапрыемстваў — на 9,3 працэнта. Палякі сталі больш плаціць за адзенне і абутак (3,7 %). Інфляцыя таксама закранула такія сферы, як ахова здароўя (6,5 %), адукацыя (6,3 %) і сувязь (2,6 %). Значна падаражэў прадуктовы кошык. У параўнанні з красавіком 2021-га цэны на цукар узраслі на 35 працэнтаў, на мяса птушкі — амаль на 47 працэнтаў, на ялавічыну — на 30 працэнтаў. Амаль на 26 працэнтаў падаражэлі масла і мука. Цэны на хлеб узраслі на 23,7 працэнта. Пры гэтым урад Польшчы не робіць рэальных захадаў для таго, каб спыніць інфляцыю ў краіне, якая скача галопам, а толькі спрабуе адсунуць справу на перыяд пасля выбараў. Пра гэта заявіў былы прэм'ер-міністр Польшчы, экс-кіраўнік Нацбанка краіны Марэк Бэлька ў інтэрв'ю тэлеканалу TVN24. Чаму польскія ўлады падманваюць людзей?

### ЯК ПРАЖЫЦЬ?

Жыхары Польшчы з-за імклівага росту цэн пачалі абмяжоўваць свае штодзённыя выдаткі, менш адкладваць і радзей карыстацца аўтамабілямі. Аб гэтым сведчаць вынікі апытання, праведзенага польскай аналітычнай кампаніяй ARC Rynek i Opinia. Згодна з апытаннем, 38 працэнтаў жыхароў Польшчы ў апошні час былі вымушаныя адмовіцца ад некаторых паслуг, напрыклад ад наведвання рэстаранаў. Столькі ж апытаных заявілі, што цяпер адкладваюць значна менш грошай у запас, паколькі з-за больш высокіх цэн ім даводзіцца больш траціць. Пры гэтым 13 працэнтаў рэспандэнтаў прызналіся, што ўвогуле адмовіліся ад зберажэнняў.

Больш за трэць палякаў прызнаецца, што ім даводзіцца абмяжоўваць свае штодзённыя выдаткі, каб хапіла грошай пражыць да канца месяца. Кожны чацвёрты сцвярджае, што не можа дазволіць сабе асноўныя выдаткі. Каля 35 працэнтаў рэспандэнтаў сказалі, што з-за высокіх цэн на бензін сталі радзей перамяшчацца на аўтамабілі. Пры гэтым пяць працэнтаў разглядаюць магчымасць продажу аўто.

Амаль кожны пяты паляк (18 працэнтаў) адмовіўся браць запланаваны крэдыт, а 26 працэнтаў прызналіся, што плануюць пагасіць крэдыт як мага хутчэй, бо апасаюцца, што працэнтныя стаўкі будуць працягваць расці. Шэсць працэнтаў апытаных заявілі, што не могуць дазволіць сабе больш высокія плацяжы па іпатэцы, таму думаюць аб продажы нерухомасці. Кожны пяты паляк прызнаецца, што аддае перавагу нешта купляць, а не трымаць грошы на рахунку, бо іх кошт змяншаецца. 17 працэнтаў апытаных заяўляюць, што шукаюць новыя варыянты ўкладання грошай.

Цяперашняя эканамічная сітуацыя прымушае палякаў прымяняць розныя стратэгіі, звязаныя з інвеставаннем, зберажэннямі і спажываннем, адзначыла ARC Rynek i Opinia. Пры гэтым сярод спажыўцоў назіраюцца два падыходы. Першы з іх, які дамінуе, заснаваны на абмежаванні спажывання. Рэспандэнты заяўляюць, што ва ўмовах росту цэн, інфляцыі і павышэння працэнтных ставак яны найперш адмаўляюцца ад некаторых пакупак і паслуг. Спецыялісты адзначаюць, што такі падыход не ідзе на карысць эканоміцы. Другі падыход заключаецца ў павелічэнні спажывання, паколькі некаторыя людзі лічаць, што лепш патраціць грошы, чым чакаць, пакуль яны працягнуць абясцэньвацца. Палякі лічаць, што банкаўскія ўклады з невысокімі працэнтамі не абараняюць іх зберажэнні.

### СМЕЦЦЕ ЗАМЕСТ ВУГАЛЮ

Больш за палову жыхароў Польшчы (каля 50,7 працэнта) лічаць барацьбу з інфляцыяй найважнейшай задачай, якая стаіць у найбліжэйшыя месяцы перад урадам Польшчы. Аб гэтым паведаміла польская газета Rzeczpospolita са спасылкай на вынікі апытання, праведзенага агенцтвам SW Research. Згодна з ім, 22 працэнты рэспандэнтаў лічаць, што ў найбліжэйшы перыяд польскія ўлады павінны разблакіраваць сродкі з Фонду рэканструкцыі ЕС, якія Еўракамісія замарозіла з-за крытыкі судовай сістэмы ў Польшчы.



Старшы менеджар праектаў SW Research Малгажата Бадзон распавяла, што барацьбу з інфляцыяй лічаць прыярытэтнай задачай урада амаль два з трох рэспандэнтаў (63 працэнты) ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў. Такі адказ часцей за іншых рэспандэнтаў давалі жыхары вялікіх гарадоў. Rzeczpospolita адзначае, што ў апошнія месяцы польскі ўрад сутыкнуўся са шматлікімі крызісамі. Прыпыненне паставак расійскага газу, адмова Польшчы ад імпарту вугалю і магчымае эмбарга на нафту з Расіі прывядуць да росту цэн на энергарэсурсы, што выльецца ў павышэнне інфляцыі ў краіне. Пры гэтым улады краіны прынялі рашэнне аб павелічэнні выдаткаў на войска да трох працэнтаў ВУП. Гэта стане дадатковым цяжарам для бюджэту.

На фоне галапіруючай інфляцыі і імклівага росту цэн на бензін і камунальныя паслугі ўрад шукае спосабы папоўніць дзяржаўны бюджэт. У прыватнасці, разглядаецца магчымасць абкласці насельніцтва новымі падаткамі, паведаміла Rzeczpospolita. Паводле даных выдання, урад Польшчы, якому страшэнна патрэбныя грошы для выканання перадвыбарных абяцанняў, заняты распрацоўкай падатку на пустыя кватэры, а таксама на трэцяе і наступнае жыллё. Паводле неафіцыйных даных, Міністэрства развіцця і тэхналогій Польшчы ўжо вывучае рынак жылля і кансультуецца з экспертамі. Падобным аналізам таксама займаецца Міністэрства фінансаў.

Па словах польскага эканаміста Марэка Ляховіча, калі ў краіне інфляцыя перавышае 12 працэнтаў, ураду даводзіцца недзе шукаць фінансавыя сродкі. «Можна ўвесці новы падатак або збор, лепш невялікі, што закране невялікі працэнт насельніцтва, які, пажадана, не належыць да выбаршчыкаў кіруючай партыі. Таму тэма падатку на пустыя кватэры вярнулася», — заўважыў Марэк Ляховіч. Паводле яго слоў, увядзенне такога падатку можа змяніць рынак жылля ў Польшчы. Заможныя палякі, якія жадаюць купіць кватэру, каб укласці грошы, задумаюцца, ці варта тое рабіць. Бо за жыллё, дзе яны не плануюць пражываць, давядзецца плаціць падаткі. Чакаецца, што ўладальнікі кватэр пачнуць здаваць жыллё.

Тым часам жыхары Польшчы вымушаныя спальваць смецце, каб ацяпліць дамы, бо з-за падаражання вугалю не могуць сабе яго дазволіць, паведаміла Gazeta Wyborcza. Адзначаецца, што за апошнія некалькі месяцаў вугаль у краіне падаражэў больш чым на 100 працэнтаў. Менш забяспечаная частка насельніцтва Польшчы больш не можа сабе дазволіць яго набыць. Каб абагрэць сваё жыллё, людзі цяпер вымушаныя спальваць смецце, газеты і ўсё, што ёсць пад рукой. Так, адзін з жыхароў невялікага мястэчка пад Варшавай Яцэк расказаў карэспандэнтам выдання, што цяпер, калі падаражала літаральна ўсё, пачынаючы ад ежы і заканчваючы вугалем, яго сям'я вымушаная эканоміць, таму адмовілася ад ацяплення дома. З надыходам цёплага надвор'я стала прасцей, аднак ёсць праблемы з падагрэвам вады. Яцэк падзяліўся, што з трывогай чакае надыходу наступнай зімы, бо пра запасы вугалю трэба думаць ужо цяпер.

### ЗЛАЧЫННЫЯ РАШЭННІ

Як растлумачыў Марэк Бэлька, інфляцыя мае ўласцівасць паскараць, дэстабілізаваць эканоміку і, як вынік, можа прывесці да эканамічнага калапсу. «Рана ці позна ўладам давядзецца мець справу з інфляцыяй і змагацца з ёй балючымі метадамі», — заўважыў эксперт. Паводле яго слоў, інфляцыя больш за ўсё ўдарыць па маламаёмасных, таму што цэны на тавары першай неабходнасці, у тым ліку прадукты харчавання, растуць хутчэй за астатнія. «У гэтых людзей няма рэсурсаў, каб перажыць складаны перыяд. Таму мае сэнс абараніць самых бедных ад наступстваў інфляцыі. Гэта азначае, што грамадству ў цэлым давядзецца несці цяжар барацьбы з інфляцыяй», — сказаў экс-прэм'ер.




Былы прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск заклікаў цяперашні ўрад краіны перастаць ашукваць простых палякаў і ўвесь Еўрапейскі саюз, паведаміла газета Rzeczpospolita. Польшча каторы месяц не можа атрымаць сродкі з Фонду рэканструкцыі ЕС, бо Еўракамісія выступае супраць судовай рэформы ў краіне. Акрамя таго, па распараджэнні Еўрапейскага суда Варшава абавязаная выплачваць штраф за пратэрміноўку ліквідацыі Дысцыплінарнай палаты Вярхоўнага суда. Па словах Дональда Туска, замест таго каб атрымліваць грошы ад Еўропы, краіна вымушаная выплачваць ёй штрафы. «Ужо шмат-шмат месяцаў уся Польшча чуе запэўніванні ад прэм'ера, ад міністраў гэтага ўрада, што заўтра-паслязаўтра яны зробяць неабходныя крокі, каб гэтыя мільярды трапілі ў Польшчу», — заявіў Туск.

Па словах колішняга прэм'ера, неабходна як мага хутчэй аднавіць разбураную цяперашнім урадам сістэму правасуддзя ў Польшчы. Такім чынам, грошы з еўрапейскіх фондаў, што належаць Польшчы, будуць разблакіраваны. Туск дадаў, што людзі жадаюць бачыць вырашэнні праблемы, а не слухаць абяцанні ўладаў. Цяперашнія рашэнні, якія прымае польскі ўрад, ён назваў тымі, якія «супярэчаць жыццёвым інтарэсам Польшчы і палякаў», а таксама злачынствам супраць інтарэсаў краіны і польскіх сем'яў.

Перспектывы зусім не абнадзейваюць. Польскі эканамічны інстытут прагназуе, што ў найбліжэйшыя месяцы рост цэн на прадукты харчавання яшчэ больш паскорыць інфляцыю ў краіне. Канфлікт на Украіне ўжо прывёў да павышэння цэн на пшаніцу, масла і мяса. Акрамя таго, Еўропа зноў змагаецца з праблемай засухі, што прывядзе да падаражання гародніны і садавіны. «Нельга выключаць, што пасля летніх канікулаў цэны на прадукты харчавання будуць амаль на 20 працэнтаў вышэйшыя, чым летась», — спрагназавалі эксперты Польскага эканамічнага інстытута.

### ЗАЛОЖНІКІ ГЕАПАЛІТЫКІ

Палітыка Польшчы дэструктыўная, і гэта ўжо адчуваюць на сабе ўсе польскія хатнія гаспадаркі, заявіў БелТА палітолаг Вадзім Баравік. Ён канстатаваў, што Польшча сёння знаходзіцца пад поўным кантролем ЗША. «Іх знешняя палітыка шмат у чым дыктуецца Вашынгтонам, пачынаючы ад разгортвання ваенных баз на тэрыторыі Польшчы, заканчваючы тым, што ўрад прымае абсалютна нявыгадныя для Польшчы рашэнні, — сказаў Вадзім Баравік. — Польшча губляе на транзіце, на тым, што растуць цэны на энерганосьбіты». А цэны на энерганосьбіты — гэта заўсёды рост сабекошту вытворчасці, гэта значыць, любы канчатковы прадукт, выраблены ў Польшчы, будзе каштаваць даражэй і будзе менш канкурэнтны на сусветных рынках, будзе назірацца дэфіцыт харчавання ў Польшчы па шэрагу таварных груп. Зноў жа ўраджайнасць будзе ніжэйшай, будзе дэфіцыт».

«Жыроўкі растуць, асабліва прыватных дамоў, ацяпленне будзе дорага каштаваць зімой. Гэта яны яшчэ мінулую зіму перажылі па нармальных цэнах, а наступная зіма іх чакае вельмі суровая, — працягнуў палітолаг. — Паліва даражэе ў Польшчы і назіраецца дэфіцыт пэўных таварных груп. Жыллё сёння для нашых так званых палітычных мігрантаў непад'ёмнае. Сёння яны вымушаныя выязджаць са сталіцы ў больш маленькія гарады, таму што не могуць сабе дазволіць з тымі даходамі, якія яны атрымліваюць у Польшчы, аплачваць якаснае жыллё ў буйных гарадах. Гэта тое, што яны публікуюць у сваіх блогах, на YouTube-каналах, скардзяцца на жыццё ў Польшчы, бо яны могуць сабе дазволіць сёння толькі трэцясортнае жыллё для таго, каб там неяк пражыць».

Польшча зрабіла ўласных грамадзян заложнікамі сваёй мілітарысцкай геапалітыкі, заявіў БелТА эксперт грамадскага аб'яднання «Белая Русь», палітолаг Пётр Пятроўскі. «Сёння ў плане энергетычнай палітыкі Варшава ператвараецца ва Украіну. Я нагадаю, што менавіта недзе гадоў 5 таму ва Украіне таксама з-за вось гэтага бессэнсоўнага супрацьстаяння з Расіяй павялічылі цану для ўласных грамадзян на камунальныя паслугі ў некалькі разоў», — адзначыў Пётр Пятроўскі. Палітолаг падкрэсліў: усе цудоўна разумеюць, да чаго тое прывядзе. «Так, пэўнае павышэнне людзі яшчэ стрываюць, будуць менш купляць, зменшыцца базавы камфорт грамадзян Польшчы. Але відаць, што польскі ўрад накіраваны на тое, каб і надалей пагаршаць гэты ўзровень жыцця, што прывядзе ў канчатковым выніку да такіх жа сумных наступстваў як і ва Украіне. Гэта таксама да таго, што проста грамадзяне Польшчы паступова будуць адмаўляцца аплачваць жыллёва-камунальныя паслугі. І пытанне толькі ў тым, навошта гэта польскаму кіраўніцтву і ці з'яўляецца Польшча тут суверэннай краінай. Гэта выклікае вялікія сумненні, — дадаў Пётр Пятроўскі. — Таму што на фоне той жа Венгрыі, якая праводзіць зусім альтэрнатыўную палітыку, абараняе інтарэсы грамадзян ад санкцыйнага вар'яцтва калектыўнага Захаду, Польшча, наадварот, чамусьці знаходзіцца ў авангардзе гэтых шалёных дзеянняў і вымушае ўласных грамадзян цягаць каштаны з тарыфнага агню жыллёва-камунальных паслуг, расплачваецца іх дабрабытам і ўзроўнем жыцця».

**Пётр ДУНЬКО.**

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ЧПТУП «Мебельный Формат» (продавец) извещает о проведении 28 июня 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Местонахождение имущества: г. Гомель, ул. Владимирова, 12Б** | | | |
| 1 | Кромкооблицовочный станок ND515, инв. № 0000000003 | 530,00 | 53,00 |
| 2 | Сверлильно-присадочный станок MZ7121A, инв. № 0000000002. Сверлильно-присадочный станок VBM5, инв. № 000000004 | 4 000,00 | 400,00 |
| 3 | Агрегат пылеулавливающий УВП-5000, 3 входа, ф 160 мм, инв. № 000000009. Аспирационная система, инв. № 0000000006. Компрессор ECO AE-1500-30-HD, 8 атм, 530 л/мин, инв. № 000000010. Счетчик электрический Миртек, инв. № 25 | 1 940,00 | 194,00 |

**Продавец: ЧПТУП «Мебельный Формат»**, г. Гомель, ул. Владимирова, 12Б. Контактные телефоны: +375 29 345-09-66, +375 29 639-48-94.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 27.06.2022 г. в 17.00.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом (ИП) РБ – копии свидетельства о государственной регистрации юр. лица (ИП), устава юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность; представителем физ. лица (ИП) РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, физ. лица, ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет 31, 32, 33 стр. паспорта, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **7 (семи) рабочих дней** после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

## ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,

*опубликованную в газете «Звязда» от 17 декабря 2021 года, с изменениями и дополнениями, опубликованными в газете «Звязда» от 18 февраля 2022 года*

**по объекту «Жилищный комплекс повышенной комфортности с объектами социально-общественного назначения и подземной парковкой в квартале улиц Немига – Коллекторная – К. Цеткин»**

**Внести изменения и изложить в новой редакции следующие разделы проектной декларации:**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

«начало строительства – октябрь 2019 г.;

планируемый срок окончания строительства – декабрь 2022 г.»

**Результаты государственной экспертизы проектной документации.**

«Положительные заключения государственной экспертизы от 22.01.2019 № 825-15/18, от 27.02.2019 № 825-15/18-Д1, от 13.10.2021 № 425-15/21, от 06.04.2022 г. № 114-15/22, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза»».

**Подраздел «Строительная готовность жилых помещений» раздела «Характеристика объекта строительства»:**

«- частичная внутренняя отделка: черновая штукатурка лоджий, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;

- вентиляция – естественная по схеме: приток через окна (вентиляционные клапана), вытяжка через вентблоки санузлов и кухонь;

- электроснабжение – в квартирах предусмотрена установка распределительных щитов с установленными внутри аппаратами управления и защиты, без установки электроплиты, розеток (за исключением одной розетки под модем) без внутриквартирной разводки электроснабжения и электроосвещения;

- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета воды;

- канализация – стояк;

- отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);

- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;

- видеодомофон».

**Сведения о правах застройщика на земельные участки, собственника земельного участка, его границах и площади**:

«- земельный участок с кадастровым номером 500000000005008409 площадью 0,9489 га, представленный ООО «Гостевой дом» в аренду для строительства объекта «Жилищный комплекс повышенной комфортности с объектами социально-общественного назначения и подземной парковкой в квартале улиц Немига – Коллекторная – К. Цеткин», расположенного по адресу: г. Минск ул. Немига, 46. Свидетельство (удостоверение) № 500/1054-1612 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право аренды), составленное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 2 октября 2019 года;

- земельный участок с кадастровым номером 500000000005008410 площадью 0,6863 га, представленный ООО «Гостевой дом» для строительства инженерно-транспортной инфраструктуры объекта «Жилищный комплекс повышенной комфортности с объектами социально-общественного назначения и подземной парковкой в квартале улиц Немига – Коллекторная – К. Цеткин», расположенного по адресу: г. Минск ул. Немига, 46. Свидетельство (удостоверение) № 500/526-12888 о государственной регистрации возникновения права на земельный участок (право аренды), составленное РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 04 марта 2022 года».

Раздел «**Условия заключения договоров создания объекта долевого строительства**» дополнить абзацем следующего содержания:

«В организации действует система скидок, зависящая от общей площади объекта долевого строительства, размера первоначального взноса, периода рассрочки и графика внесения платежей».

УНП 691532819

## О реализации имущества должника – ОАО «Телеханский завод столярных изделий»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Управляющий в деле о банкротстве ОАО «Телеханский завод столярных изделий» ООО «Конвиконсалтинг», директор Кончук Виктор Викторович, тел.: 80164521014, 80333633178 |
| **Продавец, юр. адрес** | ОАО «Телеханский завод столярных изделий» (225275, г. п. Телеханы, ул. Заводская, д. 1, Ивацевичский район, Брестская область) |
| **Дата, время, место проведения торгов** | Первый повторный аукцион состоится **15 июня 2022 года в 11.00** по юридическому адресу продавца |
| **Сведения о предмете торгов, местонахождении и порядке ознакомления** | Имущество в виде двухэтажного административного здания 1991 года постройки, общей площадью 1049,8 кв. м, сети водопровода протяженностью 48,6 м, тепловые сети протяженностью 244,6 м. Осмотр имущества осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу продавца. Информация и сведения ежедневно у организатора торгов. Сведения размещены на сайтах **http://bankrot.gov.by; www.selstr.by;** их также можно получить у организатора торгов |
| **Начальная цена предмета торгов** | 255 823,11 руб. (с учетом НДС 20 %) |
| **Шаг аукциона** | 5 % от начальной стоимости лота 12 791,16 руб. (с НДС 20 %) |
| **Порядок проведения торгов, оформления** | Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов. Договор купли-продажи заключается в течение двух рабочих дней с даты уплаты затрат, связанных с организацией и проведением аукциона. Победитель (претендент) обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в сроки, установленные договором купли-продажи. Если покупатель нерезидент Республики Беларусь, оплата производится в иностранной валюте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты. В случае признания торгов несостоявшимися, предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претенденту на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять % |
| **Размер, сроки перечисления суммы задатка** | Задаток – 5 % от начальной стоимости лота перечисляется не позднее **14.06.2022** на р/с BY60BAPB30122500600110000000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНН 200099487, ОКПО 05889294. Назначение платежа: задаток за участие в торгах |
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявления на участие в торгах принимаются **не позднее 17.00 14.06.2022** на mail@tzsi.by или zsi2006@tut.by. К заявке прилагаются и направляются в отсканированном виде следующие документы: для юр. лиц – свидетельство о государственной регистрации, устав юр. лица, решение высшего органа управления юр. лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета торгов, по итогам их проведения; для ИП – свидетельство о госрегистрации в качестве ИП; для физ. лиц – стр. 31, 32, 33 паспорта |
| **Иная информация** | Победитель (претендент) возмещает затраты, связанные с подготовкой по организации и проведению аукциона в размере 7 761,32 руб., за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГР сведений о банкротстве, за публикацию объявления в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» согласно счет-фактуры, стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуры. Данные затраты подлежат уплате в течение трех рабочих дней с даты проведения аукциона |
| **Ранее опубликованные объявления** | Журнал: «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» за 2022 год: № 3. с. 63; ЕГР сведений о банкротстве; сайт ГО «Брестоблсельстой» www.selstr.by; газета «Звязда» от 23.03.2022, с. 14 |

## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «ТЕНКИНВЕСТ»,

***опубликованной в газете «Звязда» от 01.04.2022 г.***

**по объекту «Жилая многоквартирная застройка в границах ул. Л. Беды – ул. 1-я Поселковая – ул. Восточная – ул. 1-я Базисная в г. Минске» 5 очередь. Жилой дом № 05 по генплану.**

**Цена одного квадратного метра** общей площади жилых помещений с учетом лоджии составляет сумму в белорусских рублях эквивалентную **1 500 долларам США**. Подлежащая оплате сумма определяется по согласованному сторонами курсу белорусского рубля к доллару США на дату поступления денежных средств на счета Застройщика.

**Количество объектов строительства для заключения договоров в совокупности 10 (десять) штук** из которых 1-комнатные квартиры общей площадью по СНБ от 46,61 до 48,80 кв. м, 2-комнатные квартиры общей площадью по СНБ от 61,79 до 63,64 кв. м, 3-комнатные квартиры общей площадью по СНБ от 78,98 до 79,42 кв. м.

**Обязательным условием для заключения договора долевого строительства на жилое помещение является приобретение не менее одного машиноместа в многоэтажной гараж-стоянке по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 46.**

**Условия оплаты:** оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно либо в установленный договором период по графику платежей.

По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.

**Условия возможного изменения цены строительства застройщиком в одностороннем порядке**: основанием для изменения застройщиком в одностороннем порядке цены договора является нарушение дольщиком условий предоставления скидки.

**Информация о процентном соотношении в строящемся объекте граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий**: обязанность привлекать граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, при долевом строительстве объекта у Застройщика отсутствует.

**Условия ознакомления с информацией по проекту, порядок приема и регистрации заявлений на заключение договоров:**

ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству, можно на сайте **www.4sezona.by**, а также в отделе продаж Застройщика «4 Сезона»: г. Минск, ул. Леонида Беды, 45, тел. +375 44 782-07-07, где также можно подать заявление на заключение договора в рабочие дни – с понедельника по пятницу; рабочие часы – понедельник – пятница с 9.00 до 17.30; обед – с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

УНП 191116618

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Багута, ул. Центральная (объект 05/2020), дер. Дуброва (объект 49/2021), дер. Вишня, ул. Приозерная (объект 24/2021) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **дер. Багута, ул. Центральная** | 624883000601000116 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 30 000 |
| 2 | **дер. Дуброва** | 624883003801000352 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 30 000 |
| 3 | **дер. Вишня, ул. Приозерная** | 624883001801000046 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 12 000 |

**Аукцион состоится 30 июня 2022 г. в 15.00 в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел.: 801776, 68030).**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

УНП 693142165

## ИНФОРМАЦИЯ О ТОРГАХ

**Организатор электронных торгов:** Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ИНСТИТУТ СТАНДАРТИЗАЦИИ И СЕРТИФИКАЦИИ», 220053, г. Минск, ул. Новаторская, д. 2А, каб. 208, +375 17 269 69 99

**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Торги проводятся 27.06.2022** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме

| № лота | Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль GAZ-2752;** г. Минск, ул. Новаторская, д. 2А | Грузовой вагон (WAGON), год выпуска – 2006, пробег 244 991 км., объем двигателя 2 500 см куб., бензин, кузов (VIN) № X9627520060467788; 27520060242290 | 3 415,60 | 300,00 |

**Продавец: По лоту 1.** *Научно-производственное республиканское унитарное предприятие «Белорусский государственный институт стандартизации и сертификации», г. Минск, ул. Новаторская, д. 2А, каб. 208; тел. +375 17 269 69 99.*

Извещение опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу в глобальной компьютерной сети Интернет 26.05.2022. Электронный адрес http://gki.gov.by/ru/.

УНП 100219737

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
26 МАЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 8 (15931)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Ганна ТРУБЯЦКАЯ:

# «МАЛАДЫЯ МАЮЦЬ ПРАВА БЫЦЬ НА ВЯЛІКАЙ СЦЭНЕ»



**Наша гераіня — артыстка з чароўным голасам, якая можа спяваць у розных дыяпазонах і танальнасцях, выклікаючы ў публікі захапленне і шквал эмоцый... Сёлета яна прадставіць Беларусь на XXXI Міжнародным конкурсе эстраднай песні «Віцебск-2022». Прызнаецца, што з дзяцінства была гатовая змагацца за мару быць на сцэне, і ведае дакладна, чаго вартыя поспех і прафесіяналізм. А пра супадзенні на сваім шляху, канкурэнтаў і веру, якая натхняе быць лепшай і скараць новыя вяршыні, Ганна Трубяцкая распавяла «Чырвонцы. Чырвонай змене» пры сустрэчы.**

***— Летам вы будзеце прадстаўляць нашу краіну на конкурсе маладых выканаўцаў «Віцебск-2022». Як ідзе падрыхтоўка?***

— Рыхтуемся мы на базе прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ», які ўзяў мяне пад сваё крыло. Адразу пасля адбору адбылася сустрэча з міністрам культуры, дзе прысутнічалі Аляксандр Шакуцін, Анджаліна Мікульская, Леанід Шырын, і мы абмяркоўвалі працэс падрыхтоўкі да конкурсу. Думаю, што ў выніку ў нас збярэцца цудоўная каманда. Бо, напрыклад, з той жа Анджалінай Мікульскай мы пазнаёміліся падчас арганізацыі майго сольнага канцэрта ў Палацы Рэспублікі (яна была рэжысёрам), і гэта было адразу супадзенне. Той выпадак, калі ты можаш з чалавекам падтрымліваць стасункі не толькі ў рамках работы, але і проста звярнуцца па любым пытанні, параіцца. Пакуль мы яшчэ не вызначыліся канчаткова з кампазіцыямі для конкурсу, але як толькі выберам іх, то пачнём актыўна прадумваць вобразы, касцюмы і працаваць над вакалам.

***— А каго з дзясяткі прэтэндэнтаў бачылі сваімі рэальнымі канкурэнтамі?***

— Гэта вельмі складанае пытанне для мяне, бо кожны з іх быў дастойны, каб прадстаўляць краіну на «Славянскім базары». У аднаго мне падабаліся падача матэрыялу і яго ўнутраная харызма, а ў іншага — тэмбр. Хтосьці меў нерэальна прыгожы вобраз. Я не стану выдзяляць кагосьці аднаго, таму што кожны меў сваю «разыначку», якая давала яму перавагу ў барацьбе за запаветную статуэтку пераможцы адбору. Але, мяркуючы па водгуках калег і блізкіх мне людзей, я ў той вечар нечым усё ж выдзялялася. Памятаю, як пасля першага тура на фінале адбору зайшла ў грымёрку і ўбачыла паведамленне ад свайго сябра і калегі Яўгена Курчыча, які напісаў, што глядзіць канцэрт у прамым эфіры, і я сярод дзясяткі, без сумнення, найлепшая. Можа, якраз усё гэта і дапамагло перамагчы. Калі я скажу, быццам умею і магу зрабіць нешта лепш за ўсіх, то гэта будзе сігналам, што мне трэба сыходзіць з прафесіі.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Аты-баты...

# ...ІДУЦЬ ПРАЗ ТІКТОК У САЛДАТЫ,

## або Для чаго палкоўнік стварыў акаўнт у сеціве

**У сучасным свеце існуе вялізная колькасць розных сацыяльных сетак, адной з самых папулярных сярод моладзі з'яўляецца TikTok. Гэта пляцоўка, на якой размяшчаюцца ў асноўным кароткія відэа гумарыстычнага і забаўляльнага характару. Аднак ваенны камісар Віцебскай вобласці палкоўнік Руслан ШКОДЗІН здолеў не толькі набраць больш за 500 тысяч падпісчыкаў, але і прыцягнуў увагу моладзі да патрыятычнага выхавання, развеяў страхі і вайсковыя міфы ў прызыўнікоў.**



Тое, што наш герой будзе вайскоўцам, ён ведаў з самага дзяцінства. Яго бацька быў ваенным, і Руслан з малых гадоў ездзіў з ім па гарнізонах і натхніўся гэтай прафесіяй. З-за таго, што час быў складаны, яму давялося павучыцца ў двух ваенных вучылішчах і Мажайскім ваенным тэхнічным інстытуце. А сёння ён з'яўляецца ваенным камісарам Віцебскай вобласці.

— Ідэя стварыць акаўнт voenkom.pro ў інтэрнэце ўзнікла крыху больш за год таму. Галоўнай нашай мэтай было жаданне наладзіць камунікацыю з хлопцамі — будучымі прызыўнікамі, каб з дапамогай гумару мы маглі данесці да моладзі сур'ёзныя рэчы, а таксама развейваць асноўныя міфы і страхі, якія датычацца арміі. Даволі доўга выбіралі сацыяльную сетку, у якой будзем весці свой профіль.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Выведаць галоўнае

# ПАТРЫЯТЫЗМ — АЛГАРЫТМ, ЯКІ НЕЛЬГА ПЕРАРЫВАЦЬ

**Сёлета Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі адзначае дваццацігоддзе, і ў Магілёве да такой даты вырашылі стварыць кнігу «Гэта наша з табой біяграфія», каб пад адной вокладкай сабраць усе добрыя справы, якімі ганарыцца арганізацыя. Першы сакратар Магілёўскага абкама БРСМ Уладзімір ПАЎЛОЎСКІ дэманструе напрацоўкі і адзначае, што ў кнігу ўвойдзе не толькі інфармацыя за два апошнія дзесяцігоддзі, а наогул больш чым за 100 гадоў, бо БРСМ — гэта пераемнік яшчэ савецкага ВЛКСМ. Таму «нашу з табой біяграфію» Магілёўскі абкам БРСМ піша разам з абласным Саветам ветэранаў, які ўзначальвае былы маладзёжны актывіст Анатоль Глаз.**



Патрыятызм выхоўваецца на сімвалах.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# ПАТРЫЯТЫЗМ — АЛГАРЫТМ, ЯКІ НЕЛЬГА ПЕРАРЫВАЦЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Спяшаемся падрыхтаваць выданне да юбілейнай даты 6 верасня, — удакладняе Уладзімір Паўлоўскі. — Яно ахопіць перыяд з 1918 года да сёння. Гэта будзе самая поўная інфармацыя па дзейнасці маладзёжнага саюза ў нашай вобласці.

***— Не баіцеся, што на фоне БАМа і цаліны дасягненні сённяшняй моладзі будуць выглядаць сціпла?***

— Цяперашняя моладзь нічым не горшая за тую, што была ў савецкія часы. Так, змяніліся выклікі, сама рэчаіснасць, у нас свае мэты і задачы, і мы з імі спраўляемся. Наша моладзь працуе ў будатрадах, на прадпрыемствах, у аграгаспадарках — і шмат хто выходзіць у лідары. У нас вялікая колькасць цікавых і сапраўды ўплывовых праектаў, усе яны накіраваныя на стварэнне. Напярэдадні 9 Мая мы займаліся добраўпарадкаваннем воінскіх пахаванняў — прыбіралі тэрыторыю, рамантавалі помнікі, фарбавалі агароджы. А нехта палічыў, што мы проста прыйшлі і паклалі кветкі.

***— А чым канкрэтна можа прывабіць сёння моладзь членства ў БРСМ?***

— Грошы тут, вядома, не раздаюць, але калі актыўны чалавек з выразнай грамадзянскай пазіцыяй удзельнічае ў нашых конкурсах, мы яго заахвочваем. Запрашаем у цікавыя паездкі, напрыклад, нядаўна ездзілі ў Пскоў і Стаўрапаль. Апошнім разам на сямейны форум выязджала маладая сям'я, якая працуе ў холдынгу «Бабушкіна крынка». Сужэнцы вярнуліся натхнёныя, з жаданнем паўдзельнічаць яшчэ дзе-небудзь. Мы раскручваем таленты, якія потым заяўляюць пра сябе ў праекце «100 ідэй для Беларусі». А гэта вялікія магчымасці рэалізавацца. У нас ёсць кірункі для развіцця творчай моладзі, арганізоўваем стартапы. Хлопцы і дзяўчаты



**Уладзімір Паўлоўскі дэманструе асабісты знак «За адзнаку ў ахове грамадскага правапарадку».**

актыўна ўдзельнічалі ў конкурсе маладзёжных ініцыятыў, чатыры праекты прайшлі экспертную ацэнку і атрымаюць гранты. Гэта, лічы, добрая прэферэнцыя для членаў БРСМ.

Летам праводзім маладзёжны сямейны сельскагаспадарчы праект «Уладар вёскі». Два апошнія гады яго вынікі падсумоўваліся на купальскім свяце ў Александрыі. Летась перамагла сям'я з Круглага. У якасці падарунка яны атрымалі магчымасць з'ездзіць у аквапарк «Лебядзіны». Вярнуліся вельмі ўражаныя.

А яшчэ мы развіваем міжнародныя сувязі. Летась падчас форуму «Ад Брэста да Уладзівастока» пабывалі ў сталіцы Прымор'я, пасябравалі з равеснікамі з іншых рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Па выніках сустрэчы прайшоў тэлемост паміж Маладзёжным парламентам Прыморскага краю і нашым. Мы расказалі пра асаблівасці сваёй дзейнасці, яны — сваёй, дамовіліся, у якім кірунку будзем супрацоўнічаць.

***— Як правіла, у рэгіёнах ажыццяўляюцца рэспубліканскія праекты. А ці ёсць ініцыятывы рэгіянальнага паходжання?***

— Напярэдадні Дня Перамогі мы запусцілі вялікі праект патрыятычнай накіраванасці «Дарогамі памяці і славы». Ён уключаў наведванне кожнага раёна Магілёўскай вобласці. Два тыдні перад святам наша аўтакалона разам з перасовачнай палявой кухняй і двума музеефікаванымі аўтобусамі аб'язджала населеныя пункты. Адна мабільная выстава прысвячалася гісторыі вобласці, другая — Вялікай Айчыннай вайне. Было шмат ахвотных паглядзець экспазіцыі. У населеных пунктах, дзе прыпыняліся, арганізоўваліся дыялогавыя пляцоўкі, дзе мы ў нефармальнай абстаноўцы сустракаліся з моладдзю, размаўлялі на хвалюючыя тэмы. У нашых радах шмат працуючых маладых людзей. І многія знаходзяць час для грамадскай работы. У кожным раёне ёсць паркі сямейных дрэў. Стала ўжо добрай традыцыяй, калі маладая сям'я саджае дрэва, а потым даглядае яго. Вельмі папулярная наша магілёўская ініцыятыва — «Бітва двароў». Двор, які перамагае, атрымлівае ў падарунак спартыўную пляцоўку. Летась такім чынам мы зрабілі спартыўную пляцоўку каля школы № 28. Самі знаходзім спонсараў, дзесьці дапамагае горад. Яшчэ адзін даволі гучны праект — «Аднаўленне святынь» — нарадзіўся менавіта на Магілёўшчыне. Цяпер гэта акцыя рэспубліканская. Але мы па-ранейшаму самі вырашаем, што будзем рабіць на тэрыторыі вобласці. Летась, напрыклад, аднаўлялі крыніцы, сёлета добраўпарадкавалі тэрыторыю вакол храмаў. Нашы актывісты працавалі ў аграгарадку Лясная Слаўгарадскага раёна, каля храма ў Палыкавічах, у Магілёве. Летась выязджалі ў Горкі, дапамагалі будаваць капліцу.

Праекты «Уладар вёскі», «Звон смутку» — таксама магілёўскія. Першапачаткова «Звон смутку» праводзіўся толькі ў нас, гэта была наша ініцыятыва, і яе падтрымалі ўлады і грамадскасць. На досвітку 22 чэрвеня мы збіраліся ў нашых гераічных Буйнічах, каб ушанаваць памяць тых, каго забрала вайна. Летась гэта традыцыя стала ўжо рэспубліканскай. Вельмі часта вось такія брэндавыя праекты фарміруюцца менавіта ў рэгіёнах, а калі становяцца рэспубліканскімі, складваецца ўражанне, што «рэгіянальшчыкі» нічога арыгінальнага самастойна і прыдумаць не могуць. Насамрэч, у нас шмат цікавых мерапрыемстваў рэалізоўваецца ў раёнах. Калі бачым, што ад іх ёсць эфект, бяром на ўзбраенне і распаўсюджваем на ўсю вобласць.

***— Адзін з вашых кірункаў — працаўладкаванне. Раскажыце пра яго падрабязней...***

— Гаворка ідзе выключна пра студэнцкія атрады, у якіх у канікулярны час моладзь можа папрацаваць і адпачыць. Летась мы такім чынам працаўладкавалі 3,5 тысячы чалавек. Нашы байцы працавалі на будаўніцтве трасы М1 у Падмаскоўі, выязджалі на работу ў Анапу — у парк-атэль «Усход», дзе жылі па графіку: два дні працуеш, два — адпачываеш. У выніку і грошай падзарабілі, і адпачылі, а ў Анапе, дзе працавалі студэнты Магілёўскага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій, яшчэ і вопыту набраліся па арганізацыі харчовага бізнесу. Наогул у будатрадаўскага руху вельмі моцны прафарыентацыйны пачатак. Маладыя людзі бліжэй знаёмяцца з асаблівасцямі розных прадпрыемстваў, што потым вельмі дапамагае ім вызначыцца з месцам работы.

***— На вашу думку, патрыятызм — пачуццё прыроджанае або яго трэба выхоўваць?***

— На мой погляд, патрыятызм менавіта выхоўваецца, прычым у шматлікіх аспектах. Я ў свой час, калі вучыўся ва ўніверсітэце, у складзе маладзёжнага атрада «Сокал» дапамагаў міліцыі лавіць злачынцаў. Тады вельмі актуальная была праблема распаўсюджвання спайсаў. Дагэтуль з гонарам захоўваю ўзнагарод знак «За адзнаку ў ахове грамадскага правапарадку», якім быў адзначаны асабіста. Маёй дачцэ Еве ўсяго чатыры гады, шлі з ёю нядаўна ў дзіцячы садок, і яна звярнула ўвагу на беларускі сцяг: маўляў, калі ён ёсць на будынках, значыць, мы ў сваёй краіне. Іх так у садку навучылі. Я быў вельмі ўзрушаны. А аднойчы яна спытала, хто гэта дзядзя на партрэце ў маім кабінеце. Я сказаў ёй, што гэта Прэзідэнт. І цяпер яна пазнае яго, калі мы глядзім тэлевізар. У працэсе выхавання павінны быць задзейнічаны ўсе — бацькі, выхавальнік у дзіцячым садку, настаўнік у школе, дэпутат у сваёй акрузе. З маленькіх пазлаў потым выбудоўваецца агульная карціна. Правільна выхаванае дзіця не будзе чакаць, калі нехта прыйдзе і навядзе парадак каля яго дома. Наадварот, яшчэ і прыклад падасць іншым. Заўсёды трэба пачынаць з сябе. Ёсць людзі, якія скардзяцца, пішуць лісты ва ўсе інстанцыі з-за таго, што ім дзесьці нешта не зрабілі, не пафарбавалі. Па сутнасці, пустая справа: паклікаў суседзяў ці пайшоў сам пафарбаваў. Ты ж тут жывеш. Акрамя канкрэтных спраў, павінна весціся і тлумачальная работа. Узяць, напрыклад, Буйніцкае поле пад Магілёвам. Адкуль яно ўзнікла? Трэба расказваць дзецям, што былі вайна, адступленне, цяжкія страты. Тлумачыць, навошта мы адзначаем 9 Мая, кветкі ўскладаем да помнікаў, што стаіць за гэтай датай. Калі наладзіць паўнавартасную інфармацыйную работу, маладыя людзі будуць прыходзіць у такія месцы свядома. Выхаванне — гэта алгарытм, які, калі недзе перарываецца, разбураецца ўся сістэма. Адзінага меркавання ўжо не будзе. Кажу гэта як фізік-матэматык.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
**Цалкам матэрыял чытайце**
**на сайце zviazda.by.**

*Знайсці сябе*

# «З КОНЬМІ НІКОЛІ НЕ БЫВАЕ СУМНА»

**«Спорт — гэта жыццё», — пісаў калісьці ў «Одзе спорту» заснавальнік сучасных Алімпійскіх гульняў П'ер дэ Кубертэн. Доказам таго, што гэта не толькі прыгожая цытата, а сапраўднае крэда, служыць гісторыя Вольгі ВАСЕЦКАЙ, трэнера коней і інструктара па верхавой яздзе для замежнікаў Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі ў Ратамцы.**

З самага дзяцінства маленькая Воля захаплялася высакароднымі, хуткімі і моцнымі жывёламі — коньмі. Бацькі нярэдка бачылі, як яна бегала па хаце на карачках. На здзіўленае «Што ты робіш?» дзяўчынка весела адказвала: «Гуляю ў конікаў». Зразумела, што калі ў дзіцяці ёсць моцны інтарэс і пэўныя здольнасці, а ў бацькоў магчымасці, то закладзеныя прыродай таленты будуць развівацца. А далей... Хто ведае, мабыць, гэта стане прызваннем?

Верагодна, так і адбылося ў Вольгі. Яна прыехала першы раз у Ратамку, калі ёй было восем, і засталася там на 15 гадоў. Спачатку гэта былі трэніроўкі па выхадных у пракаце, потым дзяўчына пайшла ў спартыўную навучальную групу, дзе правяла два гады, а пасля падрыхтоўкі трапіла ўжо ў прафесійны спорт. І толькі маючы за плячыма стаж верхавой язды 13 гадоў, пачала сама трэніраваць.

Не сталі перашкодай і моцныя мігрэні, ад якіх пакутавала дзяўчына. «Усе хваробы кудысьці знікаюць, — дзеліцца Вольга. — Становішся здаравей, нібыта гэта чараўніцтва, прычым ва ўсіх маіх сяброў так. Амаль ніхто сур'ёзна не хварэе».

Сёння Вольга займаецца з маладымі коньмі (ад трох да шасці гадоў). «Атрымліваецца, што спачатку «мацёрыя» коні вучаць спартсмена ездзіць, — кажа дзяўчына, — а потым ужо ён сам, набраўшыся досведу, трэніруе нявопытных маладых конікаў».

Вольга працуе інструктарам па верхавой яздзе для замежнікаў. Яна добра валодае кітайскай і англійскай мовамі. Сёлета выпускаецца з факультэта міжнародных адносін БДУ па спецыяльнасці «Кітаязнаўства». Веданне замежных моў вельмі дапамагло дзяўчыне ў рабоце: «Неяк у мяне месяц трэніравалася амерыканка, якая прыехала да бабулі ў Беларусь на летнія канікулы, — успамінае дзяўчына, — па-руску яна амаль не размаўляла».

З кітайцамі — іншая гісторыя. Часам у Ратамку прыязджаюць жыхары Паднябеснай з жаданнем навучыцца ездзіць вярхом. Тых, хто не ведае рускую мову, адразу адпраўляюць да нашай гераіні. Цяпер яе кліенты — маладая пара кітайцаў, студэнты БДЭУ. Калі яны пабывалі першы раз у Ратамцы, то адначасова здзівіліся і ўзрадаваліся, што тут ёсць інструктар, які ведае іх мову. Самі яны ні рускай, ні англійскай мовай не валодаюць.

Аб звычайным рабочым дні ў Ратамцы Вольга расказвае наступнае: «Спачатку я прыходжу, пераапранаюся, затым іду да сваіх конікаў, частую іх цукрам або яблычкамі (трэба ж задобрыць), цалую ў носік, потым сядлаю, і мы ідзём працаваць».

Адначасова і мінусам, і плюсам сваёй дзейнасці дзяўчына называе работу з жывымі істотамі: «З коньмі ніколі не бывае сумна, ніводны дзень не падобны на іншы. Мы сябруем з імі, укладваем у іх часцінку сваёй душы. У адказ атрымліваем вялікую эмацыянальную аддачу ад гэтых цудоўных жывёл. Мінус у тым, што, нягледзячы на вялікія памеры і сілу, коні патрабуюць вельмі далікатных адносін — лёгка атрымліваюць траўмы. А яшчэ падчас спаборніцтваў бываюць розныя нечаканасці. Напрыклад, ты настроены на перамогу, а конь «не з тога капыта» ўстаў — не хочацца яму сёння вялікіх дасягненняў, або наадварот: ты памыляешся, а партнёр чатырохногі дапамагае».

У будучым Вольга марыць купіць уласнага каня і працягваць займацца конным спортам. На яе думку, дзейнасць у Ратамцы цудоўна



разбаўляе шэрыя будні і кампенсуе сядзячую работу ў офісе.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

# ...ІДУЦЬ ПРАЗ ТІКТОК У САЛДАТЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Спачатку я даў сваім падначаленым указанне зрабіць аналіз усіх сацыяльных сетак і адначасова з імі праводзіў уласнае вывучэнне, каб хутчэй уліцца ў інфармацыйнае асяроддзе. Вывучыўшы велізарную колькасць сацыяльных сетак, прыйшлі да высновы, што неабходны для нас кантынгент знаходзіцца менавіта на папулярнай пляцоўцы TikTok. Што б мы ні казалі, але ў моладзі цяпер зусім іншае мысленне, гэта пакаленне візуалаў, ім падабаецца атрымліваць інфармацыю праз відэа, і названая сацыяльная сетка накіравана менавіта на гэта.

Выбраўшы патрэбную пляцоўку, Руслан Шкодзін узяў усё ў свае рукі і пачаў здымаць першыя відэа. Паводле яго слоў, спачатку яму патрабаваўся час, каб прыстасавацца да такога фармату, бо да акаўнта ў TikTok у яго была толькі старонка ў «Аднакласніках». Палкоўнік прызнаецца, што ён не чакаў такой папулярнасці, першапачаткова разлічваў на мінімальную колькасць падпісчыкаў, а ў выніку мае больш за пяцьсот тысяч гледачоў, з іх, паводле статыстыкі сацыяльнай сеткі, прыкладна 70 працэнтаў людзей мужчынскага полу. Усе падпісчыкі з розных краін: Беларусі, Расіі, ёсць і з Казахстана, наогул практычна з усёй постсавецкай прасторы.

— Першапачаткова планавалася, што мы будзем здымаць тэматычныя ролікі і відэаадказы на пытанні падпісчыкаў. Прычым у залежнасці ад таго, да якой сферы адносіцца пытанне, будзе выбірацца спецыяліст, які дасць



**У першы час усе ўспрымалі ваенкама як вобраз, не верылі, што сапраўдны палкоўнік здымае ролікі для TikTok.**

разгорнуты пісьмовы адказ. Таксама планавалася здымаць ролікі аб жыцці ў войску. Пакуль рыхтавалі базу для здымак, я яшчэ раз прааналізаваў гэтую сацыяльную сетку і зразумеў, што яе кантэнт у асноўным гумарыстычнага характару. Тады вырашыў зняць сам першае відэа-дуэт, на якім проста паківаў галавой на ролік, зняты раней. На маё здзіўленне, людзям гэта спадабалася, яно набрала 600 тысяч праглядаў.

Працягваючы асвойваць сацыяльную сетку, наш герой зразумеў, што ў яе ёсць свае асаблівасці і прынцыпы дзейнасці. Каб і далей набіраць вялікую колькасць праглядаў і наладжваць камунікацыю з будучымі прызыўнікамі і людзьмі, якія цікавяцца армейскімі пытаннямі, палкоўнік Шкодзін звярнуўся па дапамогу да некалькіх папулярных блогераў-мільённікаў.

— Хлопцы дастаткова моцна нам дапамаглі. Яны растлумачылі, што трэба публіцы, якія відэа будуць «залятаць», а якія не знойдуць водгуку. Пасля кантактавання з імі мы зразумелі, што кантэнт павінен быць лёгкім і гумарыстычным, таксама ў кадры мусіць быць адзін чалавек, каб запамінаўся вобраз. Акрамя таго, яны паглядзелі маё першае відэа і сказалі, што такі фармат



можа «зайсці» аўдыторыі. Прааналізаваўшы ўсе парады, вырашыў і далей здымаць у фармаце дуэтаў. Гэта калі я знаходжу ўжо апублікаванае кім-небудзь відэа і здымаю на яго рэакцыю. Цяпер ролікі выкладваю штодня, асабліва шмат часу, каб зняць і выкласці відэа, не патрабуецца, літаральна некалькі хвілін. Звычайна раблю тое ў абед ці пасля работы. Прыемна назіраць, што людзям сапраўды падабаецца, яны нават самі прапануюць, на чыё відэа зрабіць наступную рэакцыю, адзначаючы мяне пад рознымі ролікамі. Як правіла, выбіраю тыя, дзе назбіралася больш за ўсё рэакцый.

Руслан Шкодзін распавёў, што ў першы час усе ўспрымалі ваенкама як вобраз, не верылі, што сапраўдны палкоўнік здымае ролікі для TikTok. Для іх гэта было проста забаўкай. Аднак калі наш герой пачаў адказваць ім на пытанні, падпісчыкі ўсвядомілі, што гэта не проста забаўляльны кантэнт.

— Для таго каб адказваць людзям, я завёў акаўнт у Instagram, цяпер там ужо больш за 2700 чалавек. Шчыра прызнаюся, што гэта адымае больш часу. За ўвесь перыяд адказаў ужо на некалькі тысяч паведамленняў. Першапачаткова, як я згадваў раней, мы думалі, што рабіць тое будуць розныя людзі ў залежнасці ад спецыфікі, але гэтага не адбылося. Бывае, што задаволіць інтарэс магу адразу, а часам даводзіцца пагаварыць з калегамі ці звярнуцца да дакументацыі і законаў, каб даць максімальна падрабязны і кваліфікаваны адказ.

**Дастаткова часта яму пішуць маці хлопцаў, задаюць пытанні, часам проста хочуць развеяць свае перажыванні.**

Для сябе палкоўнік вылучыў некалькі катэгорый пытанняў. Самыя распаўсюджаныя датычацца прызыўнікоў — як правіла, іх задаюць юнакі прыкладна з 12 да 18 гадоў. Яны даведваюцца аб медыцынскіх абследаваннях, як яны праводзяцца, пра крытэрыі для адбору ў тыя ці іншыя войскі, аб навучанні, атрыманні правоў у ДТСААФ, цікавяцца кантрактнай службай. Таксама ўзнікаюць пы-

**Палкоўнік прызнаецца, што ён не чакаў такой папулярнасці, першапачаткова разлічваў на мінімальную колькасць падпісчыкаў.**

танні аб паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы на спецыяльнасці ваеннага профілю. Старэйшыя мужчыны цікавяцца парадкам праходжання ваенных збораў. Таксама палкоўнік адзначае, што дастаткова часта яму пішуць маці хлопцаў, задаюць пытанні, часам проста хочуць развеяць свае перажыванні.

— Наша работа ў TikTok і Instagram — толькі малая доля таго, што мы робім, каб наладзіць камунікацыю з прызыўнікамі. Акрамя таго, праводзіцца работа ў школах, ствараюцца Цэнтры дапрызыўнай падрыхтоўкі, у функцыі якіх уваходзіць не толькі навучанне асновам ваеннай справы, але і патрыятычнае выхаванне. Цяпер у нашай вобласці ўжо створаны васямнаццаць цэнтраў. Я лічу, што мы займаемся высакароднай і несумненна важнай справай, бо любоў да сваёй Радзімы і разуменне значэння слова «патрыятызм» адыгрываюць велізарную ролю ў фарміраванні чалавека як асобы. Не хочацца казаць гучнымі і збітымі фразамі, таму проста хачу пажадаць нашай моладзі, каб у век, калі інфармацыі вельмі шмат, яны заўсёды звярталіся да афіцыйных крыніц, больш чыталі літаратуры і ведалі гісторыю сваёй дзяржавы.

**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота дадзены героем.**

*Бачыць мэту*

# «У ПРАМЫМ ЭФІРЫ СКЛАДАНА І АДКАЗНА»,

## ці Як гэта — пабыць вядучай на ТБ?

**Нядаўна на канале «Беларусь 2» завяршыўся другі сезон рэаліці «Хачу ў «ПІН_КОД». Дзесяць крэатыўных і таленавітых маладых людзей змагаліся за месца новага вядучага маладзёжнай праграмы. Сваімі ўражаннямі падзялілася адна з удзельніц праекта, студэнтка I курса факультэта журналістыкі БДУ Ангеліна САРОКА.**

***— Як ты даведалася аб гэтым творчым спаборніцтве?***

— На журфаку запісалася ў гурток «Канферанс», арганізатар якога адправіла спасылку ў агульную групу: «Паспрабуйце сябе ў «ПІН_КОД!» Вырашыла запоўніць анкету і пастаралася зрабіць тое крэатыўна. Неўзабаве са мной звязалася вядучая праграмы Наташа Паўшок, якая адбірала патэнцыяльных удзельнікаў. Я мала ведала аб праграме, але азнаёмілася з ёй у кароткія тэрміны. Для кастынгу прыдумала ўласную рубрыку пра DIY-упрыгажэнні. Мне заўсёды падабалася рабіць нешта сваімі рукамі, я займалася пляценнем з бісеру і трубачак, скрапбукінгам, дэкупажам, таксама малявала і нават у інтэрнаце ўпрыгожыла свой пакой.



Ангеліна Сарока.

***— Што адбывалася на кастынгу? Ці было страшна?***

— Насамрэч успаміны не вельмі прыемныя, бо заданне я не зразумела і «шыкоўна» яго правaліла! Але, на шчасце, настаўнік адной з камандаў Жан Сянкевіч вырашыў даць мне другі шанц. Хутчэй за ўсё, з-за маёй яркай знешнасці, а можа, убачыў патэнцыял. Ва ўсякім выпадку, Жан неаднойчы сцвярджаў потым, што не пашкадаваў аб сваім рашэнні.

***— Магчыма, ты разгубілася перад камерай?***

— Не, камеры я не баюся, я ж відэаблогер. Каля сямі гадоў вяду YouTube-канал Lina Key, на якім у мяне больш за тысячу падпісчыкаў. З імі дзялюся яркімі момантамі свайго жыцця, абмяркоўваю падлеткавыя праблемы — забаўляльны кантэнт, так скажам. Памятаю, у самым пачатку расказвала пра вяселле хамякоў і здымала смешныя відэа, трэнды. Мне хацелася стасункаў, і людзі пакідалі свае каментарыі: і станоўчыя, і не вельмі. Стала збіраць на добрую камеру і ноўтбук. Дзякуючы каналу я і вырашыла пайсці ў журналістыку, мару весці інтэрактыўныя рубрыкі і размаўляць з аўдыторыяй. Цяпер з-за занятасці рэдка здымаю, але буду працягваць займацца відэахостынгам, гэта мая аддушына.

***— З якімі цяжкасцямі сутыкнулася падчас шоу?***

— Спачатку мне было складана ўліцца ў каманду, бо на праект прыйшла пазней за астатніх. Гэта заўважалі і самі ўдзельнікі, і мой настаўнік, таму я неаднойчы станавілася намінантам на вылет. Але рук не апусціла, пачала старанна працаваць і, на думку каманды «ПІН_КОД», прыкметна



Каманда Жана Сянкевіча.

вырасла. Маёй перавагай было тое, што я ўжо ўмела манціраваць ролікі. А за час праекта яшчэ больш павысіла свой узровень у апрацоўцы відэа.

***— У якой ролі ты адчувала сябе больш камфортна: карэспандэнта ці вядучага?***

— Я зразумела, што працаваць у прамым эфіры складана і адказна. Усведамленне таго, што нічога нельга будзе змяніць, запісаць нанава, скоўвае і дадае хвалявання. Таму мне прасцей загадзя прадумаць сцэнарый і зняць рэпартаж.

***— Што табе даў удзел у рэаліці?***

— Спадабаліся заняткі па сцэнічнай мове. Вядома, я і раней трэніравалася над пастаноўкай голасу і правільным вымаўленнем, але ў дадзенай справе практыка ніколі лішняй не бывае. Таксама цікавымі былі ўрокі па здымцы відэа, раскадроўцы, правільным ракурсе. У цэлым я зарадзілася энергіяй і набыла бясцэнны вопыт, які, упэўнена, спатрэбіцца мне ў далейшым.

***— Што адчувала, сыходзячы з праекта за крок да фіналу?***

— Крыўдна, вядома. Насамрэч яшчэ напярэдадні ў мяне было прадчуванне, што далей не прайду. Але надзея не памірала да апошняга. Я раней за ўсіх прыехала на пляцоўку і заспела працэс падрыхтоўкі да эфіру. Устанаўлівалі апаратуру, вядучыя паўтаралі тэкст, візажысты ўсіх фарбавалі. Я зразумела, як моцна хачу працаваць у гэтай сферы.

***— Рэдакцыя праграмы казала аб тым, што адкрытая да новых ідэй і прапаноў. Ці не думаеш вярнуцца са сваёй рубрыкай?***

— Цяпер планую адпачыць ад камер, але нядоўга. Хутка ў мяне пачнецца практыка, і хто ведае, можа, я прайду яе на канале «Беларусь 2».

**Паліна ШЫНКЕВІЧ,**
**вучаніца 10 класа гімназіі № 6 г. Маладзечна.**
**Фота дадзены гераіняй.**

SEX-БАЛЯСЫ

# ПАМІЖ НАМІ, ЛЮДЗЬМІ І ЗВЯРАМІ

**Памятаеце айчынную сацыяльную рэкламу пра тое, што збіраць смецце — наш клопат, а не янота? І сапраўды, чаго гэтым павінен займацца янот? Вось у Швецыі, калі верыць паведамленню, хочуць навучыць крумкачоў за ежу збіраць на вуліцах недакуркі і іншае дробнае смецце і прыносіць яго ў аўтамат, які абменьвае «працу» на корм. Чаго толькі часам не прыдумаюць што людзі, што звяры...**

Самцы гладкіх марскіх змей пераследуюць чалавека ў вадзе, прымаючы яго за самку свайго віду. Пры гэтым іх самкі, у сваю чаргу, бачаць у дайверах шанц пазбавіцца ад назойлівых кавалераў. («— Чым вы захапляецеся?» — «Сачу за ядавітымі змеямі». — «Працуеце ў жаночым калектыве?» — «Так».) Такія змеі даўжынёй да двух метраў і вагой да трох кілаграмаў сустракаюцца на ўсходзе Індыйскага і на захадзе Ціхага акіянаў. Пры гэтым ніхто з іх не спрабаваў укусіць нырца, хоць змеі даволі ядавітыя. («Мужчынская жыццёвая мудрасць: часам чым ярчэйшая афарбоўка, тым больш небяспечная асобіна».) Замест гэтага некаторыя самцы нават абвівалі канечнасці чалавека — гэтак жа, як яны робяць з целамі самак падчас заляцанняў. Усе падобныя выпадкі здараліся ў сезон размнажэння. Самцы «атакавалі» дайвера ў асноўным адразу пасля няўдалай спробы дагнаць самку ці канфлікту з сапернікам, а самкі — калі спрабавалі ўцячы ад самца. («— Лёня, што ты бегаеш туды-сюды з гэтай мухалапкай?» — «Маша, не перашкаджай! Я забіў пяць мух... Тры самцы і дзве самкі!» — «А як ты даведаўся?» — «А што тут даведвацца? Тры на канапе, а дзве на тэлефоне...»)

У самак дэльфінаў знайшлі такі ж палавы орган, як і ў... жанчын, які можа дапамагаць ім адчуваць задавальненне падчас спароўвання. («Жонка: — «З цягам часу гаспадары становяцца падобнымі на сваіх гадаванцаў». Муж, усхвалявана: — «Слухай, Люсь, давай не будзем ката кастрыраваць».) Раней навукоўцы даведаліся, што дэльфіны могуць займацца сексам не толькі для таго, каб размнажацца, але і для атрымання асалоды. («У акіяне вакол самкі кружыць кіт і выгаворвае той: «Мы — від, які вымірае! Мільёны людзей ва ўсім свеце занепакоеныя лёсам нашай папуляцыі! Сотні экалагічных арганізацый намагаюцца зрабіць нешта для нашага захавання! А ты мне што?! «Галава баліць, галава баліць...»)



Пяціметровага кракадзіла асядлаў дацкі турыст у Аўстраліі. Біёлаг Нільс Джэнсан і яго таварышы падчас падарожжа па парку дзікай прыроды знялі на відэа смяротна небяспечны трук з грабянёвым кракадзілам. («Чабурашка, чуеш мяне?» — «Гена, ну што за пытанні? Паглядзі на мяне. Вядома, чую!») Турыст прынадзіў рэптылію, а калі драпежнік пачаў есці, 22-гадовы Нільс сеў яму на спіну, а потым паўтарыў такія дзеянні яшчэ некалькі разоў. Біёлаг сказаў, што гэта было вельмі цікава, але рызыкоўна. («Кракадзіл сцішыўся і паўгадзіны прыкідваўся бервяном, калі на яго выпадкова прысеў адпачыць Мікалай Валуеў».) Аўстралійскія ўлады асудзілі ўчынак. Яны заклікалі турыстаў паводзіць сябе асцярожна побач з кракадзіламі, асабліва з грабянёвымі, якія з'яўляюцца найбуйнейшымі з усіх існуючых рэптылій. («Займальная заалогія. Ці ведаеце вы, што больш за ўсіх таварышаў у тамбоўскага ваўка?»)

У Новай Зеландыі апосум узяў... у заложнікі жанчыну і не выпускаў яе з дому да прыезду паліцыі. Паводле слоў гаспадыні, яна спрабавала выйсці з жылля і дайсці да машыны, калі жывёліна ўстала ў яе на дарозе і прымусіла вярнуцца назад. «Тэрарыста» злавілі, адвезлі далей ад жылых раёнаў і выпусцілі на волю. Паліцыя выказала здагадку, што апосум мог быць нейкім збеглым гадаванцам або дзіцянём, нядаўна разлучаным з маці. («Вакол дзяўчыны трэба віцца чмялём. З кожным колам робячыся ўсё чмялей і чмялей...»)

Алень уварваўся ў цырульню і ўчыніў пагром у цэнтры Нью-Ёрка. Жывёліна разбіла вітрыну і трапіла ў памяшканне, перад гэтым пераскочыўшы праз кліентку, якая яшчэ і атрымала ад аленя капытом па галаве. Некаторы час нечаканы госць бегаў па салоне прыгажосці, а потым выбег на вуліцу праз дзверы і знік у невядомым кірунку. («Паводле кацінага фэн-шуй ёлка не павінна быць устаноўлена вертыкальна. Нават тэарэтычна».) Алень напалохаў наведвальнікаў і работнікаў салона, аднак больш цікавіць іншае: як жывёліна апынулася ў цэнтры Нью-Ёрка?

У Пінску быў выпадак, калі наведвальніца начнога клуба адсцябала сваім бюстгальтарам ахоўніка. На знятым відэа відаць, як агаленая да пояса жанчына нападае на супрацоўніка ўстановы і б'е яго. («Убачыла павука. Закрычала. Тата спытаў, чаму крычу. «— Таму што павук». — «Ты ж большая за яго». — «А ён страшны». — «Ну, ведаеш, ты таксама не прыгажуня».) Што было прычынай канфлікту, не паведамлялася, аднак, хутчэй за ўсё, на такія дзеянні прадстаўніцу прыгожага полу натхніў алкаголь. Пагадзіцеся, ну чым не «алень»? («Леў — цар звяроў. Пакуль не прачнулася львіца...»)

